Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

16-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

АЎТОРАК 29 ЛІСТАПАДА 1932 г. № 263 (3632)

Адказны рэдактар 7-69
Адказны сакратар 4-78
Сэктароў . . . 6-15
Навуковая рэдакцыя 42-65 (два нумары)
Выдавецтва . . 2-44

1 месяц . . . 1 руб.
3 . . . . . 3 .
6 . . . . . 6 .
Падпіска прымаецца выключна на пошце і ліставозах.
Рукапісы не вяртаюцца.

РЭДАКЦЫЯ І ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК, ПЛЯЦ ВОЛІ, 17.

КОШТ АБ'ЯВЫ
1 радок пантарэлі 1 руб.

КОШТ ПУБЛІКАЦЫІ
1 дакумэнту аб згубе 2 руб.

Аб тэрміне скліканьня і парадку дня IV сэсіі ЦВК БССР X скліканьня

Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Склікаць IV сэсію Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР X скліканьня 3 студзеня 1933 году ў г. Менску.

2. Зацьвердзіць наступны парадак дня IV сэсіі:

1) Кантрольныя лічбы народнай гаспадаркі БССР на 1933 год. Дакладчык—старшыня Савету Народных Камісараў БССР тав. М. М. ГАЛАДЗЕД.

2. а) Дзяржаўны бюджэт на 1933 год.

Дакладчык—тав. А. І. ХАЦКЕВІЧ.

б) Садаклад Бюджэтнай Камісіі ЦВК БССР па дзяржаўным бюджэце на 1933 год.

3. Даклад аб пасеўных плянах на 1933 год і аб практычнай рабоце ў барацьбе за ўзьняцьце ўраджайнасьці.

Дакладчыкі—т.т. РАЧЫЦКІ, МАСЮКОЎ і ТАМАШЭЎСКІ.

4. Зацьверджаньне важнейшых настаноў, прынятых за час ад III сэсіі ЦВК БССР.

Дакладчык—т. М. П. ГНІЛЯКЕВІЧ.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
А. ЧАРВЯКОЎ.

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР
М. ЛЯЎКОЎ.

Друк—на перадавыя пазіцыі ў барацьбе за фінплян

У напружанай барацьбе, якую вядзе партыя, рабочая клясa і працоўнае сялянства Савецкага Саюзу ў справе выкананьня гігантскай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва—завяршэньне пяцігодкі ў чатыры гады і падрыхтоўка да другой пяцігодкі, пяцігодкі набудовы бязклясавага сацыялістычнага грамадзтва,—асабліва адказная роля прыпадае на бальшавіцкі друк.

Бальшавіцкі друк—калектыўны прапагандыст, агітатар і арганізатар шырокіх пралетарскіх мас і працоўнага селяніства,—гэтае вялізарную адказнасьць за сапраўднае ажыцьцяўленьне задач, якія стаяць перад сацыялістычным будаўніцтвам.

Савецкі друк зьяўляецца іменна тым арганізатарам і прапагандыстам, які спраціадае неўлімную сувязь паміж партыяй і рабочай клясай—сувязь, якая, па сваёй сіле рабіцьцца любому пералатачнаму апарату масавага характару. (Сталін).

Уладзімер Ільіч парадноўвае друк з рыштаваньнямі, якія будуюцца ва кол узвядзімае набудовы, намячаюць контуры будовы, абмяжоўваюць зносіны паміж масавымі будаўнікамі, дапамагаюць ім разьмеркоўваць працу і ацэньваць агульную выніку, дасягнутыя арганізаванай працай».

Вялікае значэньне набывае друк і на фінансавым фронце, у прыватнасьці на такім участку, як мабілізацыя сродкаў на сацыялістычнае будаўніцтва. Мы маем у сваім распараджэньні каштоўнейшыя ўзоры работы раённага і нізавога друку ў гэтай галіне. Мы ведаем прыклады, калі раённы друк, у асаблівасьці нізавыя шматты ражныя, насьцешныя і тэатралізаваныя газэты блискуча ажыцьцяўлялі сваю задачу, як калектыўнага арганізатара і на справе падцьвярджалі, што «іншых сродкаў працінуць духоўныя ніці паміж партыяй і рабочай клясай, іншага такога гібкага апарату ў прыродзе няма». (Сталін).

У гэтым сэнсе каштоўным зьяўляецца вопыт барацьбы раённых і нізавых газэт, якія сваёй сыстэматычнай і штодзённай барацьбой на фінансавым фронце, шляхам шырокай мабілізацыі армій рабселькораў і нізавога фінансавага актыву забясьпечваюць перавыкананьне з кварталу ў квартал плану мабілізацыі сродкаў («Камунар Заслаўшчыны», «Камунар Магілёўшчыны», «Калгасьнік на варце» (Лельчыцы), «Бальшавік Мсьціслаўшчыны», «Шлях сацыялізму» (Жлобін), «Ударнік Дзяржыншчыны», тэатралізаваная газэта Брэзінскага камбінату «Рупар» (Барысаў) і рад іншых).

Раённы друк зьяўляецца шматлікім надзвычайна эфэктыўных форм масавай работы. Ён указваў новыя шляхі і магчымасьці да выкананьня і перавыкананьня плану мабілізацыі сродкаў на базе самага шырокага ўдзелу працоўных горада і вёскі на аснове сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Кожнае такое праяўленьне шматлікіх вы друку зьяўляецца пацьверджаньнем таго, што друк—вастрэйшая зброя ў руках партыі і рабочай клясы.

Асабліва значэньне набывае зараз раённы і нізавы друк у сувязі з абвяшчэньнем газэтай «Савецкая Беларусь» і радам іншых цэнтральных газэт усебеларускага конкурсу на лепшую работу газэт у справе садзейнасьці выкананьню фінансавага пляну IV кварталу і пляну усяго 1932 году.

Партыя і ўрад прыдае асаблівае значэньне ўсебеларускаму конкурсу.

Усебеларускі конкурс ставіць перад савецкім друкам рад канкрэтных задач, вырашэньне якіх для данага ад рэзкую часу набывае асабліва важнае практычнае значэньне. Апэрацыйна, са дзню ў дзень сачыць за ходам выкананьня фінплану, кантраляваць фінансавую работу на ўсіх вузкастках, арганізоўваць і мабілізоўваць армію рабселькораў і шырачэйшыя масы працоўных на рэалізацыю іх магчымасьцяй, арганізаваць абмен вопытам і паказ лепшых, выносіць на суд грамадзкасьці дэзарганізатараў, апартуністаў і «левых» загібшчыкаў, якія ўскажаюць клясавую лінію і парушаюць дырэктывы партыі і ўраду,—вось пэўнае высоўваецца ў якасьці асноўнай палітычнай задачы абвешчанага ўсебеларускага конкурсу друку.

Ніводнага органу бальшавіцкага друку БССР не павінна застацца па-за радамі авангардных байцоў за фінплян. Поўнае і своечасовае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу па ўсіх плацяжох, хутчэйшае скончэньне рэалізацыі пазыкі, паляпшаньне абслугоўваньня пазыкапрыхільнікаў і ўкладчыкаў у ашчадкасы, штодзённае і сыстэматычнае вядзеньне нагляду за работай фінорганаў і нізавым актывам,—вось задача раённага і нізавога друку.

БССР павінна ў IV квартале дамагчыся перамогі на фінансавым фронце з тым, каб страчаны ў III квартале чырвоны ганаровы сьцяг сьцяг Наркамфіну СССР у IV квартале зноў вярнуць назад.

Рэальнасьць фінансавага пляну 1932 г. мы сёньня дэманструем выпікамі бальшавіцкай барацьбы за выкананьне заданьняў па мабілізацыі сродкаў Заслаўскага раёну, які шатэрмінова выканаў фінплян IV кварталу і атрымаў пераходны чырвоны сьцяг НКФ БССР.

У гэтым сэнсе ня менш паказальна работа Старобінскага, Лельчыцкага, Жлобінскага і раду іншых раёнаў, якія на 20 лістапада выканалі квартальны плян па мабілізацыі сродкаў як па добраахвотных, так і па абавязковых плацяжох ад 70 да 82 проц.

Адпак вынікі першых 2-х месяцаў чацьвертага кварталу сьцвярджаюць аб слабасьці масавай работы ў радзе раёнаў па выкананьні пляну добраахвотных плацяжоў. Задачы друку—з першых-жа дзён конкурсу ўзяць пад свой непасрэдны нагляд гэтае слабае зьвяно, паказаць на вопыце лепшых, як трэба арганізоўваць масавую работу, рачуша выкрываючы тых, хто ў канцы за ключнага году пяцігодкі яшчэ не ўсьвядоміў усяго палітычнага значэньня правядзеньня штодзённай масавай работы на фінансавым фронце.

Стварыць моцную фінансавую базу для пасьпяховага завяршэньня першай пяцігодкі і стварыць працовыя рэзэрвы для бесперабойнага фінансаваньня вялізарнай праграмы будаўніцтва першага году другой пяцігодкі,—за гэта павінен рашуча змагацца цэнтральны, раённы і нізавы друк БССР.

Па Саюзе ССР

КІЕЎ. 27-XI. Нежынскі інстытут сацвыхову атрымаў ад Анры Барбюса наступны ліст: «Я атрымаў толькі сёньня ваш ліст ад 10 лістапада, адрасаваны мне ў Маскву. Вельмі шкадую, што не магу станоўча адказаць на вашае сяброўскае запрашаньне. Я павінен быў 14 лістапада быць ў Бэрліне. З вялікім задаваленьнем я наведаю вашу брацкую сям'ю. Спадзяюся, што мне яшчэ пашчасьлівіцца пабываць у вашай краіне праз некалькі месяцаў. Прашу вас, таварышы, верыць у мае брацкае пачуцьцё і найлепшыя пажаданьні.»

Анры Барбюс.

Дніпропятроўск. 27-XI. Адбылася вобласная канфэрэнцыя навуковых работнікаў. Асаблівы інтарэс выклікаў даклад Дніпропятроўскага аддзяленьня Усесаюзнага інстытуту кукурузы. Інстытут скансструяваў новую кукурузную сеялку, якая на многа павысіць прадукцыйнасьць і якасьць сеўбы кукурузы.

КІЕЎ. 27-XI. Прафэсар Базылевіч вывіў новыя матар'ялы пра знаходжаньне на Ўкраіне ў 1847—1850 г. г. французкага пісьменьніка Ганорэ Бальзака. Сярод матар'ялаў—некалькі лістоў Бальзака і цікавая перапіска аб ім шэфа жандараў з кіеўскім генэрал-губарнатарам.

▲ МАСКВА. Да 50-годзьдзя з дня сьмерці Карла Маркса ГІХЛ выпускае вялікую манаграфію выказваньняў Карла Маркса па пытаньнях эстэтыкі. Яе складаюць супрацоўнікі Камакадэміі.

▲ МАСКВА. На вячэрнім паседжаньні 6-га Ўсесаюзнага зьезду інжынэра-тэхнічных работнікаў, 26-XI выступіў з вялікай прамовай старшыня СНК СССР т. МОЛАТАЎ В. М. Зьяўленьне тав. Молатава на трыбуне сустракаецца авацыяй усяго зьезду.

▲ МАСКВА. Дзяржплан СССР склікае ў сьнежні м-цы г. г. канфэрэнцыю аб нізвуцы ў другім пяцігодзьдзі. Разгорнута вялікая падрыхтоўчая работа. На канфэрэнцыі будуць заслуханы даклады буйнейшых навуковых установаў Савецкага Саюзу—Усесаюзнай акадэміі навук, Камакадэміі, Усеўкраінскай акадэміі навук і інш.

З АПОШНІХ ПАВЕДАМЛЕНЬНЯЎ

Ратыфікацыя савецка-польскага пакту аб ненападзе

ВАРШАВА. 27-IX. (ТАСС). Прэзыдэнт Польшчы Масьціцкі падпісаў сягоньня пакт ратыфікацыі дагавору пра ненапад і ўзгадняльную канвэнцыю паміж СССР і Польшчаю.

Паведамленьне ТАСС

Прэзыдыум ЦВК СССР ратыфікаваў Савецка-Польскі пакт пра ненапад, падпісаны ў Маскве 25-га ліпеня г. г. і ўзгадняльную канвэнцыю, падпісаную 23-га лістапада г. г.

Італьянскія інжынэры аб СССР

РЫМ. 26-XI. Пасьля адкрытага ліста інжынэра Чокка ў карысьць разьвіцьця камэрцыйных, тэхнічных і культурным сувязям з СССР, у друку выступіў дэпутат парляманту, старшыня італьянскай арганізацыі інжынэраў — Дэль Буфалё. Поўнасьцю далучаючыся да прапановы Чокка аб арганізацыі таварыства для вывучэньня СССР, Дэль Буфалё піша: «Мы пераканаты, што Савецкі саюз толькі выйграе ад больш шырокага азнаямленьня з італьянскай прамысловасьцю і тэхнікай. Гэта прыводзе да ўстанаўленьня тэхнічных сувязяй, якія італьянскія інжынэры хочуць зрабіць больш цеснымі». Далей Дэль Буфалё паведамляе, што арганізацыя інжынэраў прапануе наладзіць у Маскве выстаўку італьянскай архітэктуры ды інжынэрнай справы з мэтаю разьвіцьця тэхнічных і прамысловых сувязяй з СССР. У заключэньні Дэль Буфалё выказвае ўпэўненасьць, што італьянскія інжынэры могуць аказацца ня менш, але нават больш карыснымі СССР як інжынэры іншых краін.

Бульба—Ленінграду

Адгрузіць апошнія эшалёны бульбы!

Задача адстаючых раёнаў—тэрмінова пакрыць запазычанасьць

СЁНЬНЯ БССР ПАВІННА АДГРУЗІЦЬ АПОШНЮЮ ТОНУ ЗАДАНЬНЯ. 2,5 ТЫС. ТОНЫ—ТАКАЯ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ БССР ПРАЛЕТАРАМ ГОР. ЛЕНІНА.

Палова раёнаў БССР ужо выканалі і перавыканалі свае пляны адгрузкі. Астатнія-ж раёны ганебна здалі тэмпы адгрузкі. Да такіх адносяцца: ДУБРОВЕНСКІ РАЁН (72,5 проц.), АСІПАВІЦКІ (76,1 проц.), ЦЕРАХАЎСКІ (76,3 проц.) і рад іншых.

Партыйныя і савецкія арганізацыі гэтых раёнаў невыкананьнем пляну адгрузкі паказалі сваё няўменьне выконваць важнейшыя дырэктывы партыі і ўраду. Яны не паказалі максымум гнуткасьці і апэрацыйнасьці па адгрузцы бульбы Ленінграду, кінулі адгрузку на апартуністычны самацёк. ТАКІЯ АПАРТУНІСТЫЧНЫЯ АДНОСІНЫ ДА ВАЖНЕЙШЫХ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПАВІННЫ АТРЫМАЦЬ РАШУЧЫ АДПОР. Ні ў якім разе нельга дапусьціць, каб адстаючыя раёны зрывалі нашы пляны. БССР ПРАЗ ДЗЕНЬ-ДВА БУДЗЕ РАПАРТАВАЦЬ ПАРТЫІ АБ СКАНЧЭНЬНІ АДГРУЗКІ. ГЭТА ПЕРАМОГА ДА СЯГНУТА ТОЛЬКІ ДЗЯКУЮЧЫ ПЕРАВЫКАНАНЬНЮ БОЛЬШАСЬЦЮ РАЁНАЎ СВАІХ ПЛЯНАЎ НА 50 І БОЛЬШ ПРОЦ. АДСТАЮЧЫЯ РАЁНЫ І ПАВІННЫ ГЭТА ПАМЯТАЦЬ. ЯНЫ ПАВІННЫ ТЭРМІНОВА ПАКРЫЦЬ СВАЮ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ЛЕНІНГРАДСКАМУ ПРАЛЕТАРЫЯТУ.

ФАРСУЮЧЫ ТЭМПЫ БУЛЬБАЗАГАТОВАК, ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ—ПАЧЭСНЫ АБАВЯЗАК УСІХ АДСТАЮЧЫХ РАЁНАЎ.

Бабруйск скончыў адгрузку бульбы

БАБРУЙСК. 28-XI (Ад нашага карэсп. па тэлефону). 27 лістапада пад непасрэдным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, дзякуючы рашучаму варуху, які быў зроблен у час прыезду тав. Гікало ў Бабруйскі раён, скончана адгрузка бульбы Ленінграду.

Адгружана пралетарскім цэнтрам 7.270 тон. Увага райарганізацый пераключана на поўнае заканчэньне ў бліжэйшыя дні ўсяго пляна бульбазагатовак, плян якіх на 26 лістапада выканан толькі на 88 проц.

ДАМБРОЎСКІ.

Калгасы ў авангардзе бульбаадгрузкі

ДРЫСА. Перадавыя калгасы раёну, пад непасрэдным кіраўніцтвам партарганізацыі дабіліся значных посьпехаў на фронце загатовак і адгрузкі бульбы.

Так, калгас «Заветы Ільліча», Бігосаўскага сельсавету, замест вызначанага пляну ў 17 цэнт., адгрузіў пралетарам Ленінграду 26,5 цэнт.

Калгас «Камінтэрн», Цястоўскага сельсавету заданьне па адгрузцы бульбы выканаў на 104 проц. Калгас «Кастрычнік», Луначарскага сельсавету, адгрузіў 16 тон дабраякаснай бульбы, што складае 145 проц. плянавага заданьня. Калгасы Галубаўскага сельсавету заданьне па бульбазагатоўках выканалі на 170 проц.

М. ЯРОМЕНКА.

Адгружана па БССР бульбы Ленінграду

(у тонах).

	за дзень	з пачатку кампаніі	пропант выкананьня пляну
На 28 лістапада	1.328	188.088,6	98,5

Клясава-варожыя элемэнты зрываюць работу загатоўчага апарату

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА. Рапазычанасьць пралетарам Ленінграду складае 686 тон бульбы. На 25 лістапада заданьне раён выканаў толькі на 80,6 проц.

Такія незадавальняючыя тэмпы адгрузкі бульбы тлумачацца марудным ходам бульбазагатовак. Раён яшчэ ня здаў дзяржаве каля 1000 тон бульбы. Рад сельсаветаў, як *Замайльскі, Жывагледаўскі, Чырвона-Слабодзкі і Старчынскі* ганебна зрываюць загатоўку бульбы. Процант выкананьня пляну па гэтых сельсаветах складае 50-75.

Такое становішча стварылася ў выніку дрэннай работы загатоўчых арганізацый. Клясава-варожыя элемэнты, якія пралезьлі ў загатоўчы апарат,—*Кавалёў* з райзагу і *Абрамчук*, кіраўнік райканторы Белплодагародніны разбураюць яго, п'янствуюць і г. д.

Ня гледзячы на тое, што прэзыдыум РВК пастанавіў гэтых клясава - варожых элемэнтаў зьняць з работы, яны ўсё-ж працуюць і зараз, выдучы сваю агідную дзейнасьць. РВК на гэта зусім не рэагуе. Гэта дало яшчэ большую магчымасьць *Кавалёву і Абрамчуку* разгарнуць клясава-варожую дзейнасьць і зрываць адгрузку бульбы Ленінграду.

Такія зьявішчы нецярпімы. Агентам клясавага ворага трэба даць рашучы адпор. Кавалёў і Абрамчук павінны быць неадкладна зьняты з работы і адданы пад суд.

Райпракуратура павінна сказаць сваё рашучае слова па гэтым пытаньні.

Б. М-ч.

І рузяць звыш пляну

РАГАЧЭЎ. (Наш кар.). 25 лістапада Рагачэўшчына скончыла адгрузку бульбы пралетарам Ленінграду.

Адгружана 8337 тоны пры пляне ў 8330 тон або 100,08 проц. заданьня. Па сыстэме райспажыўсаюзу адгружана 4960 тон—100 проц. пляну.

Далейшая адгрузка ня спыняецца. Сілы партарганізацыі кінуты на завяршэньне бульбазагатовак і загатовак збожжа.

КУЛЯШОЎ Хв.

Менск, ЦК КП(б)Б—тав. ГІКАЛО

Пад Вашым кіраўніцтвам і пры аказанай дапамозе з боку партыйных і савецкіх арганізацый БССР, Галоўдартрансам БССР скончана будаўніцтва дарог Борша-Менск у межах заданьня 1932 году.

Акалічнасьці, якія стварыліся, не даюць магчымасьці кіраўніцтву Цудартрансу асабіста прысутнічаць на ўрачыстым адкрыцьці указанай дарогі і вітаюць арганізацыі БССР з новай перамогай на фронце сацыялістычнага будаўніцтва БССР, якія першымі ў Саюзе паказалі нябачаныя яшчэ тэмпы па дарожным будаўніцтве.

Час. вык. аб. ЦДОР ЧОРНЫ.

Скончыў сваю работу пленум Менгаркому КП(б)Б

Увечары 26 лістапада скончыў сваю работу пленум Менгаркому КП(б)Б.

На пленуме былі заслуханы даклады дырэктароў наступных фабрык і заводаў: «Молатава», «Камунар», «Кастрычнік» і абутковай фабрыкі—аб выкананьні прамфінпляну за 10 месяцаў і даклад аб рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб нізэйшай школе.

***

Пленум вырашыў рад арганізацыйных пытаньняў.

Пленум аслабаніў ад абавязкаў членаў і кандыдатаў бюро ГК у сувязі з пераходам на іншую работу т.т. Тарасевіча, Машокова, Якубовіча і Тарупінскага.

У сувязі з пераходам на іншую работу і ад'ездам з Менску аслабанёны ад абавязкаў членаў пленуму т.т. Млодзік, Рутэнбэрг, Рыжоў, Зайцаў, Мітлін, Добрын, Красных і ад абавязкаў кандыдатаў у члены ГК Сіманоўскі, Карпенка. Пленум аслабаніў ад абавязкаў члена ГК был. дырэктара электрастанцыі тав. Цапкаватага, які зьняты з работы за тое, што не забясьпечыў нармальную работу электрастанцыі, ня гледзячы на тое, што ёсьць для гэтага ўсе ўмовы.

Пленум зьвяў са складу рэвізійнай камісіі тав. Фрыдмана, які выключаны з партыі.

Пленум кааптаваў у склад пленуму наступных таварышоў: Брагінскага—рэдактара газ. «Зьвязда», Гарачова—камандзіра 7-й дывізіі, Дзяніскевіча—нам. арг. аддзелу ГК, Кавалёва—адказнага сакратара ЦСПСБ, Малей—сакратара ГК КСМ, Соснава—сакратара парткалектыву заводу імя Варашылава, Сухарчука—дырэктара электрастанцыі, Турэцкага—нам. старшыні гарсавету, Хэйфеца—рэдактара газ. «Рабочий», Шчагіна—сакратара ГК КСМ.

Тав. Кержаневіч, заг. аддзелам каду раў ГК пераведзены з кандыдатаў у члены бюро ГК. Тав. Малей—сакратар ГК КСМ абраны кандыдатам у члены бюро.

Склад сакратарыяту ГК скарочаны да 5 чал. і пакінуты ў наступным складзе: сакратароў ГК тт. Гікало, Чернушэвіча, Шпэктараза, старшыні гарсавету тав. Валодзька, старшыні СПС тав. Шулькіна.

У заключэньне з вялікай прамовай, спатканай гарачымі апладысмэнтамі, выступіў першы сакратар ГК КП(б) тав. Гікало.

Прастоям гружаных вагонаў абвешчана барацьба

Рэдакцыі газэты „Савецкая Беларусь"

У адказ на заметку ў газ. «Савецкая Беларусь» за 17 лістапада аб прастоях па віне дыспэтчарскага апарату вагонаў, гружаных бульбай для Ленінграду,—МК руку ст. Гомель паведамляе Бел. бюро ЦК чыгункі, што пытаньне адпраўкі вагонаў з бульбай у Ленінград было прапрацавана па зьменах. 4-я зьмена абвясьціла сябе ўдарнай па барацьбе з прастоямі вагонаў. Па зьменах ставілася пытаньне аб тым, каб кожны спрэлачнік у сваім раёне сачыў за недапушчэньнем прастояў. Разгорнута сацыяборніцтва паміж работнікамі.

За старшыню Бел. бюро ЦК чыг.
ВОЖЫН.

За ГРАНІЦАЙ

Клясавая барацьба ў Германіі пашыраецца

Дэманстрацыя рабочых Бэрліну

БЭРЛІН. 25-XI (ТАСС). Учора ўвечары ў шасьці раёнах Бэрліну адбыліся зноў шматлюдныя рабочыя дэманстрацыі супроць фашысцкай дыктатуры і за окасаваньне сьмяротнага прысуду рабочаму Бартлю. У Шпандаў у часе сутычкі дэманстрантаў з паліцыяй паранены адзін паліцэйскі і адзін рабочы. Гэткія-ж дэманстрацыі адбываліся і ў Хэмніцы.

Паводле паведамленьня буржуазнага друку, «дэманстрацыі ў некаторых раёнах гораду набывалі пагражаючы характар, у сувязі з чым былі выкліканы ўзмоцненыя атрады паліцыі». Адбыўся рад сутычак. Арыштавана некалькі рабочых.

Камісары Папэнскага ўраду прускім ляндтагам ліквідаваны

БЭРЛІН. 27-XI Учора на паседжаньні Прускага ляндтагу камфракцыя ўнесла прапанову ліквідаваць пасты камісараў, зацьверджаныя агульнагерманскім урадам, абвясьціўшы ўсе распараджэньні, выданыя камісарамі, не сапраўднымі. Большасьцю 126 галасоў камуністаў і сацыял-дэмакратаў прапанова была прынята. Партыя цэнтру і нацыянал-сацыялістская партыя ўстрымаліся ад галасаваньня.

Закрыцьцё школ у Германіі

БЭРЛІН. 28-XI. «Саюз германскіх настаўнікаў» накіраваў агульна-германскаму ўраду і правіцыйным урадам мэмарандум, у якім гаворыцца, што ў сувязі з закрыцьцём многіх школ, норма вучэньня для кожнае клясы павышана ў Баварыі да 50, у Вюрцэмбэргу і Цюрынгіі—да 48 і г. д. У радзе гарадоў, як напрыклад у Гэльзенкірхэне (Рурская вобласьць) у адной клясе займаецца 70 вучняў. У выніку скарочана шмат тысяч настаўнікаў. Першымі ахвярамі скарачэньня бываюць маладыя настаўнікі. У Бэрліне, напрыклад, палову са скарочаных 1005 настаўнікаў складаюць маладыя настаўнікі. Гэты мэмарандум ня ўлічвае яшчэ апошніх мерапрыемстваў бюджэтнае эканоміі за лік народнае асьветы. У канцы кастрычніка ў Бэрліне было ізноў закрыта 60 клясаў. Лік беспрацоўных настаўнікаў павялічыўся на 45 чал. Маладыя настаўнікі на аснове апошніх распараджэньняў, да 31 красавіка 1933 г. наогул не дапускаюцца да выкладаньня. Германскі друк паведамляе аб радзе выпадкаў закрыцьця за апошнія часы школ і дзіцячых дамоў з-за недахопу сродкаў на іх ацяпленьне. У школах, якія засталіся, узмоцнена эканомія на апале і, каб затрымаць цяплыню, мала праветрываюць клясы. У вялікіх гарадох на 5—6 тысяч дзяцей прыпадае толькі адзін школьны доктар. У сувязі з гэтым пашыраюцца розныя хваробы і пошасьці ў школах.

Закрылася 7 тысяч прадпрыемстваў

БЭРЛІН. За перыяд ад 1 чэрвеня г. г. у Германіі закрылася 7000 прамысловых прадпрыемстваў. За апошні час пастаўлена на прыкол у сувязі са скарачэньнем суднаходзтва 80 параходаў.

Абвастрэньне канфлікту Польшчы з Данцыгам

БЭРЛІН. 26-XI. Канфлікт паміж Польшчай і Данцыгам з прычыны дэкрэта ванага Польшчай пераходу на польскую валюту ўсіх апэрацый на чыгунках у Данцыгскай вобласьці, абвастраецца. З Данцыгу паведамляюць, што Польшча ўжо праводзіць тэхнічную падрыхтоўку да правядзеньня ў жыцьцё гэтага дэкрэту з 1 сьнежня. У сувязі з гэтым адміністрацыя ўсіх транспартных прадпрыемстваў Данцыгу падрыхтоўвае контрмерапрыемствы, якія фактычна ліквідуюць зьвяз ціся да байкоту польскіх чыгунак. З гэтаю мэтай ад 1 сьнежня значна зьнижаюцца тарыфы на трамвайных і аўтабусных лініях Данцыгскай вобласьці, пашыраецца сетка гэтых ліній пры адначасовым пераводзе іх на кругла сутачны рух і г. д.

ВЕСТКІ З РОЗНЫХ КРАІН

Савецка-Францускі пакт аб ненападзе ад браны францускім урадам

ПАРЫЖ. 27-X. Агенцтва Ганас паведамляе: «Рада міністраў адобрыла тэкст пакту аб ненападзе і канвэнцыі аб узгаднальнай працэдуры, адносна якіх францускі і савецкі ўрады прышлі да згоды.

Дагавор адпавядае падпісанаму польска-савецкаму дагавору аб ненападзе».

Савецка-швэйцарскія гандлёвыя адносіны

ПАРЫЖ. 27-XI. Паводле паведамленьня «Журналь дэ Коммэрс» з Бэрну, швэйцарскі дэпартамэнт народнай гаспадаркі парашыў гарантаваць савецкія вэксалі швэйцарскім прамыслоўцам.

Дэпартамэнт народнай гаспадаркі ўносіць у бліжэйшым будучым у швэйцарскі парлямэнт адпаведны законапраект аб урадавай гарантыі аплаты савецкіх заказаў на швэйцарскія машыны і электрамэханічнае абсталяваньне на агульную суму ў 20 млн. швэйцарскіх франкаў.

Перамога бастуючых маракоў

ТОКІЕ. 26-XI. Як паведамляюць з Асака, забастоўка маракоў кампаніі «Амагасака кісэн кайся» скончылася перамогаю бастуючых. Адміністрацыя згадзілася задаволіць патрабаваньні аб павышэньні зарплаты і палепшаньні ўмоў працы.

Скарачэньне зарплаты чыгуначнікам

ЛЕНДАН. 28-XI. Паводле паведамленьня з Дубліну, сталая камісія па пытаньнях зарплаты пры ірляндзкіх чыгунках вынесла рашэньне аб наданьні чыгункавым кампаніям права зьнізіць зарплату чыгуначнікаў на 10 проц. для тых катэгорый рабочых, якія атрымліваюць зарплату паводле ставак 1931 г. і 5½ проц. для тых хто атрымлівае зарплату паводле ставак 1932 г. Зьнижэньне ўваходзіць у моц у першы плацежны дзень пасьля 26 сьнежня.

Беспрацоўе расьце

«Газэта Польска», (орган польскага фашызму) паведамляе што на 12 лістапада гэтага году ў Польшчы было зарэгістравана 154.582 беспрацоўных, што ў параўнаньні з колькасьцю беспрацоўных у мінулым тыдні паказвае рост беспрацоўя на 50088 чалавек.

Кампартыя заклікае да адзінага фронту

БЭРЛІН. 27-XI. Учора адбылася надзвычайная канфэрэнцыя сацыялдэмакратычнае партыі. У парадку дня стаяў даклад Брэйтшэйда аб палітычным становішчы Германіі.

Акруговы камітэт кампартыі зьвярнуўся з адкрытым лістам да дэлегатаў сацыял-дэмакратычнае канфэрэнцыі, прапануючы с.-д. рабочым далучыцца да адзінага рабочага фронту і абмеркаваць гэту прапанову ня толькі на акруговай канфэрэнцыі с.-д. партыі, але на ўсіх агульных сходах мясцовых арганізацый.

Польшча

Паліцэйская нагайка замест працы

Разгон мітынгу бастуючых трамвайшчыкаў

ВАРШАВА. 27-XI. У сувязі са зрывам перагаворaў паміж дырэкцыяй вагаўшаўскіх трамваяў і прадстаўніком прафсаюзаў па пытаньні пра заключэньне новага калдагавору, канфлікт абвастрыўся. Дырэкцыя дамагаецца скарачэньня зарплаты на 6 проц. і скасаваньня сьвяточных надбавак ды адпускных. На сёньняшні дзень прафсаюзы прызначылі агульны мітынг трамвайшчыкаў, на якім канчаткова павінна быць вырашана пытаньне пра абвяшчэньне забастоўкі. Аднак, у апошні момант улада забараніла арганізацыю мітынгу. Трамвайшчыкі, якія прыбылі на мітынг былі разагнаны паліцыяй.

10 злотых у месяц—вось „дапамога" інвалідам

ВАРШАВА. 27-XI. 30 чал інвалідаў вайны ў Варшаве, даведзеных да роспачы беспрацоўем і жабрацтвам, аб'ясьнілі ўчора галадоўку, патрабуючы павялічэньня дапамогі, або прадастаўленьня работы інвалідам замест ліс ў памяшканьні свайго саюзу. Да памога беспрацоўным інвалідам складае 10—50 злотых (злоты—каля 22 к) у месяц. Большасьць інвалідаў—беспрацоўныя на працягу двух-трох год. Шмат якім з іх за праграчне высяленьне з кватэры. На ўсе хадайніцтвы інвалідаў пра прадастаўленьне якога небудзь заработку ўлада адмовіла. Да галадоўкі 30 інвалідаў учора далучылася група з 14 інвалідаў, якія знаходзяцца ў бараках для беспрытульных.

Арышты і зьбіваньні рабочых Белавескай пушчы

ВАРШАВА. 27-XI. «Роботнік» паведамляе пра забастоўку лясных рабочых Белавескай пушчы, якая працягваецца ўжо 6 тыдняў. Забастоўка ад бываецца ва ўмовах дзікага тэрору прадпрыемцаў і паліцыі. Вялікая колькасьць рабочых арыштавана. Вы закуты ў кайданы і жорстка зьбіваюцца. Голад сярод рабочых і іх сем'яў набывае жахлівыя разьмеры. Пад экавай палацы прыцягваюцца да работы ў прымусовым парадку сялянскіх суседніх вёсак. Стачачнікі дамагаюцца павышэньня жабрацкіх заработкаў, якія складаюць 80 грошай (17 кап.) за 8 гадзінны рабочы дзень і адзін злоты 20 грошай (27 кап.) за 12-гадзінны рабочы дзень

Продаж дзяцей

ВАРШАВА. «Глос сталіцы» паведамляе, што на адзін з кірмашоў сялянка прывезла прадаваць сваю дачку. Пасьля цвярдзіканга гандлю дзіця было прададзена за 20 злотых (4 р. 40 к.). Пацікавіўшы дзіця, піша «Глос сталіцы», сялянка аддала дзяўчынку пакупніцы. Адзін са спадарожных сказаў сялянцы: «Як вам ня сорам прадаваць сваё дзіця?» Са сьлязьмі на вачох маці адказала: «Дзіця будзе, прынамсі, накормлена. У мяне яно-бы памерла ад голаду, а за 20 злотых я хоць некалькі разоў накармлю астатніх дзяцей». У кварталах, дзе пуліцца беднота, можна назіраць, як прафэсіянальны куплялюць дзяцей у дзведзеных да роспачы беспрацоўных.

Галадоўка бастуючых рабочых

НА ПАНЧОШНАЙ фабрыцы на вуліцы Матэйкі ў Лодзі доўгі час цягнулася ўпартая італьянская забастоўка рабочых супроць нявыплачваньня ім зарплаты. Нарэшце рабочыя пастанавілі абвясьціць галадоўку. Рабочыя не прымалі ежы два дні. Пачаліся выпадкі аслабеньняў з голаду, самлеўшых ратавалі іншыя рабочыя.

Толькі пасьля таго як фабрыка згадзілася выплаціць рабочым зарплату рабочыя спынілі забастоўку.

Пазбаўленьне Баршу дэпутацкага мандату

ПРАГА. 27-XI. Чэха-Славацкае агенцтва паведамляе: «Суд па выбарчых справах пазбавіў дэпутацкага мандата камдэпутата Баршу. Барша быў прысуджаны да 6 месяцаў турмы і пазбаўлены выбарчых правоў за супрацьўленьне паліцыі ў часе рабочай дэманстрацыі ў Брно. (Маравія)».

МНОЖЫЦЬ ВОПЫТ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ РАГАЧЭЎШЧЫНЫ,

якія датэрмінова выканалі плян лёназагатовак

БССР зьяўляецца адным з асноўных лёнаводных раёнаў Савецкага саюзу. Сёлетні ўраджай лёну здавальняючы, уборка яго праведзена сваячасова. Ас ноўнай задачай зьяўляецца зараз апрацаваць бяз страт і здаць (прадаць) яго дзяржаве.

Зводка аб ходзе апрацоўкі і загатоўкі лёну на 20 лістапада сьведчыць аднак аб тым, што на гэтым адказнейшым вучастку работы ёсьць пэўны прарыў. Паводле пляну, вызначанага партыяй і ўрадам, да 1 сьнежня павінна быць загатоўлена ня менш 70 проц. гадавога пляну лёнавалакна, між тым на 20 лістапада загатоўлена толькі 16,1 проц. З гэтых лічбаў відаць, на колькі марудными тэмпамі праходзяць лёназагатоўкі.

Не разгарнуліся лёназагатоўкі і па асноўных лёнаводных раёнах БССР. Напрыклад, АСЬВЕЙСКІ раён выканаў плян на 2,7 проц., ВІЦЕБСКІ—3,1, ДУБРОВЕНСКІ—5,7, ГАРАДОЦКІ—8,3 проц.

Рэзка адстае аднаасобны сэктар (10,4 проц. выканаўня). Як відаць з матарыялаў, якія мы сёньня падаём, у радзе месц сельсаветы і загатоўчыя арганізацыі праяўляюць поўную бязьдзейнасьць у справе апрацоўкі і загатоўкі лёну. Па КЛІМАВІЦКІМ раёне, напрыклад, па віне Загатлёну, прыёмныя пункты не падрыхтаваліся да за

29 лістапада

гатовак, нават не пабудавана памяшканьне для хаваньня валакна. Раённыя арганізацыі не прынялі рашучых мер, каб зьнішчыць гэтыя недахопы і наладзіць бесперабойную прыёмку лёнапрадукцыі.

Адстае таксама і калгасны сэктар. Калгасы МТС выканалі плян на 16,4 проц., калгасы РКС—21,4 проц. Неда пушчальным зьяўляецца такое становішча, калі МТС, якія лепш тэхнічна ўзброены, маюць значна больш апрацоўных машын—цягнуцца ў хвасьце. Гэта ёсьць вынік нездавальняючага кіраўніцтва ходам апрацоўкі і загатоўкі лёну з боку Трактарацэнтру. Апошні павінен рашуча палепшыць апэрацыйнае кіраўніцтва, трэба дамагчыся, каб МТС па-сапраўднаму паваж нуліся тварам да лёназагатовак.

Вялікім тормазам лёназагатовак зьяўляецца кулацкі сабатаж. Кулацка заможныя гаспадаркі злосна ня выконваюць сваіх абавязкаў. Чаго варта такая работа, калі па ЖЛОБІНШЧЫНЕ плян лёназагатовак па цьвёрдых заданьнях выкананы толькі на 1,2 проц.? ПА 15 СЕЛЬСАВЕТАХ РАЁНУ КУЛАКІ НЕ ЗДАЛІ НІВОДНАГА КІЛЕ ЛЁНАВАЛАКНА. Трэба з усёй жорсткасьцю ўдарыць па абаронцах кулака, трэба прымусіць яго выканаць цьвёрдыя заданьні.

Апартуністычныя разважаньні наконт таго, што «няма часу», або «не пае рабочай сілы»—гэтыя разважаньні не маюць пад сабой ніякага грунту.

Лён можна апрацаваць і здаць да тэрміну. Гэта на практыцы паказалі перадовыя калгасы і вёскі РАГАЧЭЎШЧЫНЫ і КРУПШЧЫНЫ. У чым «сакрэт» гэтых перамог? Асноўнае гэта тое, што вакол лёназагатовак разгорнута масава-растлумачальная работа, што сельсаветы па-сапраўднаму кіруюць лёназагатоўкамі, нададзіўшы штодзенны апэрацыйны кантроль.

Рашаючую ролю ў арганізацыі лёназагатовак адыгрывае сталая вытворчая калгасная брыгада.. Там, дзе брыгада існуе не фармальна, не на паперы, там калгасы дамагліся вялікіх посьпехаў у выкананьні ўсіх работ, у прыватнасьці і па правядзеньні лёназагатовак.

Прыклад перадавых паказвае, што лёназагатоўкі можна выканаць да тэрміну, трэба толькі па-сапраўднаму ўзяцца за справу, трэба мацней націснуць на кулака.

Наша сацыялістычная прамысловасьць чакае сыравіны. Мы павінны яе даць у мінімальна скарочаныя тэрміны. Ніводнага цэнтнэра лёнатрасты, лёнасаломкі Ураджаю 1932 г. не павін на застацца сёлетэ не апрацаваным.

Кантора Заготлёну без кадраў

КЛІМАВІЧЫ. (Наш кар.). Раённыя арганізацыі і сельсаветы мала зьвяртаюць увагі на апрацоўку і загатоўку тэхнічных культур. У выніку гэтага на 20 лістапада плян загатовак палёнавалакне выкананы на 2,2 проц., лёнасемі—65,9 проц., каноплях—53 проц..

Калгасны сэктар выканаў плян па лёнавалакне толькі на 5 проц. Калгасы Асмолавіцкага,, Арлоўскага, Гусарскага, Г.—Мыскага, Макеевіцкага, Рудзянскага, Студзянецкага і Пуцімельскага сельсаветаў не здалі ніводнага кілёграму валакна.

Яшчэ горш справа па арганізацыі апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур па аднаасобным сэктары, які выканаў плян толькі на 1 проц. Ёсьць рад сельсаветаў, дзе аднаасобнікі не здалі ніводнага граму валакна.

Адна з асноўных прычын адставаньня раёну гэта дрэнная падрыхтоўка да заготовак Заготлёну: не арганізавана бесьперабойная прыёмка валакна, штаты поўнасьцю не ўкамплектаваны, ня ўсюды ёсьць кваліфікаваныя прыёмшчыкі, сартыроўшчыкі, прасоўшчыкі; на Мілаславіцкім прыёмным пункце нават няма памяшканьня для хаваньня валакна.

З боку Заготлёну, райкалгассаюзу і МТС не разгорнута належная масава-растлумачальная работа сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў за хутчэйшае правядзеньне апрацоўкі лёну. У радзе калгасаў да апрацоўкі лёнатрасты не прыступаюць.. У калгасах «Бальшавік» і «Страла» шмат непадобрана лёну і незамочана канапель.. Па некаторых калгасах няўважліва адносяцца да апрацоўкі лёну, ня вылучаны гдказныя асобы за сваячасовае выкананьне гэтых работ, не арганізавана як сьлед работа брыгад..

Да апошняга часу няма належнага націску на кулака. Кулацка-заможныя гаспадаркі сабатуюць выкананьне цьвёрдых заданьняў па тэхкультурах. Клімаўшчына павінна ліквідаваць прарыў па фронце апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур. Заготлён, сельсаветы,, дэпутацкія групы павінны ў найкарацейшы тэрмін дамагчыся рашучага пералому па загатоўках лёну..

...ковіч.

Узор бальшавіцкай работы

РАГАЧЭЎ. (Наш кар.). Перадавыя калгасы і вёскі раёну сапраўды паказваюць, як трэба выконваць свае абавязкі перад дзяржавай па здачы (продажы) тэхкультур. Гэтыя гаспадаркі да тэрміну выканалі свае абавязкі па здачы лёну і канапель..

Калгас імя **СТАЛІНА** (Запольскі сельсавет) выканаў гадавы плян загатовак па лёнасемі і каноплях на 111,5 проц., па лёнавалакне на 100 проц.

Калгас **«Чырвоны Гай»** (Сьвяцкі сельсавет) яшчэ справіўся з загатоўкамі тэхкультур. Плян па здачы лёнасемя калгас выканаў на 287 проц., лёнатрасты—218 проц..

Перавыканалі таксама пляны загатовак тэхкультур калгасы **«Свабода»** (Гарадзецкі сельсавет), імя **КАЛІНІНА** (Забалоцкі сельсавет).

Не адстаюць ад перадавых калгасаў і рад вёсак раёну. Так, аднаасобнікі, бедняки і середняки вёскі **Шырокае** (Мяркулавіцкі сельсавет) да тэрміну выканалі плян па здачы дзяржаве лёнасемя, лёнавалакна і канапель.

Гэтых посьпехаў калгасы і аднаасобнікі дамагліся дзякуючы правільнаму і штодзённаму апэрацыйнаму кіраўніцтву з боку сельсаветаў і партячэек.

Рашаючую ролю ў датэрміновым выкананьні плянаў апрацоўкі і загатоўкі тэхкультур адыграла моцная, сталая вытворчая калгасная брыгада. Па гэтых калгасах брыгады, якія селялі і ўбіралі ўраджай, таксама былі адказнымі і за давядзеньне ўраджаю да загатоўчых пунктаў у выглядзе апрацаванай прадукцыі. Дзякуючы гэтаму брыгады сачылі за тым, каб сушні былі падрыхтаваны,, каб сваячасова забясьпечыць лёна-сушыльныя пункты патрэбным палівам і г. д. Між брыгадамі і паасобнымі членамі брыгады было разгорнута сацспаборніцтва і ўдарництва на хутчэйшае правядзеньне апрацоўкі лёну, не зьнижаючы пры гэтым якасьць яго (нумароў).

Так змагаюцца за тэхкультуры перадавыя калгасы і працоўныя аднаасобнікі. Пры жаданьні пляны загатовак можна ня толькі выканаць, але і перавыканаць да тэрміну. К. К.

Зламаць кулацкі сабатаж

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Да апошняга часу загатоўкі тэхкультур па раёне застаюцца слабым месцам работы. На 20 лістапада плян па загатоўках лёна валакна выкананы толькі на 7,1 процант, лёнасемя — 28,7 проц., канапель—11 проц.

Асноўная прычына марудных тэмпаў загатовак гэта адсутнасьць масава - растлумачальнай работы вакол лёназагатовак сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў. Нічога ня робіцца з боку пераважнай большасьці сельсаветаў, каб спатлаць цьвёрдыя заданьні з кулацка - заможных гаспадарак.. Цьвёрдыя заданьні па лёнавалакне выкананы на 1,2 проц., лёнасемі — 13,4 проц., каналлёх—1 проц. Па 15 сельсаветах кулакі і заможнікі не здалі ніводнага кілё лёнавалакна.

Кіруючыя раённыя арганізацыі абавязаны зламаць кулацкі сабатаж, разгарнуць апрацоўку і загатоўку лёну.

За-скі.

Аб ходзе апрацоўкі і загатоўкі лёнавалакна па БССР (у проц.)

	Разасланa	падабрана	Загот. лёнавалакна
На 20-XI-32 г.	95,7	85,7	16,1
Было на 15-XI	95,5	84	13,1

За ленінскія адносіны да настаўніцтва

Пастанова Бюро ГК КП(б)Б ад 25-XI-32 г. па справе на стаўніцы Афонскай

Адзначыць, што з боку былога інспэктара ГАРАНА т. МЕЕРОВІЧ былі праяўлены няправільныя, грубыя і нетактычныя адносіны да т. АФОНСКАЙ, якія выявіліся ў ігнараваньні яе, у стварэньні ёй, як загадчыцы школы, няспрыяючых умоў для работы замест чулых адносін і аказаньня тав. АФОНСКАЙ сапраўднай, практычнай дапамогі.

Адзначыць беспадстаўнасьць загаду т. ЗЕНЬКОВІЧА ад 9-VIII—32 г. у якім прапануецца спыніць рамонт у 16-й школе з-за ад'езду тав. АФОНСКАЙ у адпачынак у той час, як рамонт школы скончаны сваячасова і сваячасова пачаты заняткі ў школе.

Лічыць няправільным і беспадстаўным аслабаньне т. АФОНСКАЙ ад загадваньня школай і асабліва недапушчальным перавод т. АФОНСКАЙ з яе групай вучняў у 27-ю школу, у часе яе хваробы.

Адзначыць, што з боку парткалектыву і асабліва гаркому саюзу Працасьветы праяўлены нячулыя адносины да т. АФОНСКАЙ.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што адказныя працаўнікі ГАРАНА, парткалектыў і прафсаюз у справе тав. АФОНСКАЙ праявілі неразуменьне пастановы ЦК УсеКП(б) ас школе, і аб стварэньні ленінскіх адносін да настаўніцтва...

За нячулыя, нетактычныя адносіны да тав. АФОНСКАЙ, інспэктару ГАРАНА т. МЕЕРОВІЧ абвясьціць вымову, а загадчыку ГАРАНА т.. ЗЕНЬКОВІЧУ паставіць на від.

Прапанаваць т. ЗЕНІКОВІЧУ перавесьці т. АФОНСКУЮ са сваёй групай вучняў для работы ў 16-ю школу.

Абавязаць ГАРАНА, парткалектыў і гарком саюзу Працасьветы стварыць рабоце т. АФОНСКАЙ належныя спрыяючыя ўмовы.

Прапанаваць парткалектыву і Гаркому саюзу Працасьветы, прапрацаваць гэтую пастанову на сваіх калектывах і сярод настаўніцтва.

Даручыць ГАРАНА і культпропу ГК КП(б)Б устанавіць лепшае кіраўніцтва і нагляд за работай школы.

Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Сакратар Менгаркому КП(б)Б
ЧАРНУШЭВІЧ.

Паход саветаў за шырспажыву

ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ КАНКРЭТНЫ УДЗЕЛ ПРАФСАЮЗАЎ У ПАХОДЗЕ

Прафсаюзы ўключаюцца ў паход

Пастанова Прэзыдыуму ЦСПСБ

У сувязі з пастановай прэзыдыуму ЦВК аб правядзеньні двухмесячніку паходу саветаў за выкананьне пастановы верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні вырабу шырспажыву, Прэзыдыум ЦСПСБ **пастанаўляе:**

Прапанаваць усім ЦП саюзаў, гарпрафсаветам забясьпечыць дапамогу сэкцыям і дэпутацкім групам саветаў у правядзеньні паходу, уцягнуўшы прафсаюзны актыў і ўсю рабочую грамадзкасьць у справу арганізацыі ўтыльцэхаў, майстарань і арцеляй па вырабе прадметаў шырспажыву.

Абавязаць ЦП саюзаў, ДРПС і ФЗМК сумесна з гаспадарчымі арганізацыямі абгаварыць пытаньне аб перадачы прамкаапэрацыі лішкаў адыходаў, якія ня могуць быць выкарыстаны ў сваіх майстэрнях па выробе прадметаў шырспажыву.

Абавязаць работнікаў ЦСПСБ, якія знаходзяцца ў раёнах па розных заданьнях, уключыцца ў правядзеньне паходу за шырспажыву, аказваючы дапамогу мясцовым арганізацыям у правядзеньні данага мерапрыемства.

Абавязаць ЦП саюзу даць аналёгічныя паказаньні сваім работнікам, якія знаходзяцца ў раёнах.

Абавязаць т. Пракоф'еву (кантроль выкананьня) прасачыць за выкананьнем данай пастановы.

На бліжэйшых паседжаньнях сакратарыяту ЦСПСБ заслухаць інфармацыю паасобных ЦП, ДРПС аб іх удзеле ў паходзе саветаў за шырспажыву.

Гарсавет узначаліў правядзеньне паходу саветаў за шырспажыву

Барысаўскі гарсавет шырока разгарнуў работу па правядзеньні паходу саветаў за шырспажыву. 20 лістапада прэзыдыум гарсавету абгаварыў па гэтым пытаньні пастанову ЦВК БССР і вынёс рад практычных мерапрыемстваў па правядзеньні паходу.

22 лістапада пры гарсавеце адбылася пашыраная нарада бюро дэпутацкіх груп і сэкцый з прадстаўнікамі сампрмкаапэрацыі. Быў заслуханы даклад старшыні гарсавету аб задачах дэпутацкіх груп і сэкцый у сувязі з рашэньнямі верасеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановай ураду Савецкай Беларусі.

Нарада аднадушна ўхваліла рашэньні прэзыдыуму гарсавету і выклікала на сацспаборніцтва па правядзеньні паходу Аршанскі гарадзкі савет. Нарада пастанавіла правесьці двухмесячнік шляхам разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарництва паміж дэпутацкімі групамі, сэкцыямі і паасобнымі дэпутатамі і савецкімі актывістамі.

Пры кожным прадпрыемстве створаны апэрацыйныя тройкі з прадстаўнікоў партыйна-прафсаюзных і савецкіх арганізацый прадпрыемстваў.

На гэтай нарадзе разьмеркавана і зацьверджана шэфства дэпутацкіх груп і сэкцый гарсавету над арцелямі. Да кожнага прадпрыемства на час двухмесячніку паходу прымацаваны адказныя работнікі гарсавету. 24 і 25 лістапада дэпутацкімі групамі праведзены пашыраныя пленумы бюро дэпутацкіх груп на прадпрыемствах па пытаньнях абвешчанага паходу

ЭСТРЫНА.

Першыя дні паходу далі ўзмацненьне тэмпаў загатовак

На агульным сходзе калгаснікаў, нацыянальнага яўрэйскага сельсавету вёскі **Селец (Магілёўскі раён)** абгаворана пытаньне аб двухмесячніку паходу за рэалізацыю рашэньняў пленуму ЦК УсеКП(б) аб разгортваньні вырабу тавараў шырспажыву. Калгаснікамі вынесена пастанова ўключыцца ў паход. У гэтай пастанове калгаснікі ўзялі на сябе рад абавязацельстваў:

Арганізаваць збор утыльсыравіны. Для гэтай мэты вылучана брыгада калгаснікаў з савецкага актыву, якая сумесна з вучнямі прыступіла да рэалізацыі сваёй пастановы. Шмат утылю ўжо сабрана. Калгаснікі пастанавілі арганізаваць за час паходу два выезды на калгасны рынак з сельгаспрадукцыі (бульба, мяса малако і інш.).

Як калгасны сэктар, так і аднаасобнікі ўзялі на сябе абавязацельства выканаць на 100 проц абожжа-і мясазагатоўкі.

У выніку разгорнутай работы па двухмесячніку, маем наступныя вынікі: калі плян абожжазагатовак да рас працоўкі пастановы прэзыдыуму ЦВК быў выкананы на 38 проц., дык зараз па сельсавеце плян абожжазагатовак выкананы на 90 проц.

Сялецкаму сельсавету трэба яшчэ больш разгарнуць бальшавіцкія тэмпы і, мабілізаваўшы калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў—беднякоў і серадняковых правесьці з посьпехам двухмесячнік.

Усю сваю ўвагу сельсавет павінен зьвярнуць на стварэньне новага савецкага актыву, арганізацыю дэпутацкіх груп ва ўсіх калгасах і, мабілізаваўшы актыўнасьць працоўных мас, з посьпехам выканаць усе гаспадарча-палітычныя мерапрыемствы партыі і ўраду.

В.

Змагаемся за канкрэтныя паказьнікі

Пытаньне аб паходзе за шырспажыў кравецкай арцелі «Новы шлях» (Менск) 25 лістапада было абмеркавана на праўленьні арцелі. Тут былі належныя канкрэтныя мерапрыемствы—за што павінна змагацца арцель у час паходу.

У бліжэйшы час будзе адкрыты рамонтны цэх, будзе адкрыты ларок для закупкі ўтыльсыравіны і г. д.

Ва ўсіх цэхох арцелі ўжо праведзены сходы рабочых з пытаньнем аб значэньні паходу. У кожным цэху намечаны мерапрыемствы, за што павінны змагацца кожны цэх і кожны рабочы ў паасобку.

Ударнікі арцелі абавязаліся датэрмінова выканаць вытворчы плян IV кварталу першай пяцігодкі.

Канцэльсон.

У паход уключыўся меншвэйтэкстыльсаюз

Меншвэйтэкстыльсаюз уключыўся ў двухмесячнік паходу за шырспажыў. На паседжаньні праўленьня саюзу 23 лістапада была абгаворана пастанова прэзыдыуму ЦВК БССР аб двухмесячніку і намечана рад канкрэтных мерапрыемстваў, якія павінны будуць забясьпечыць посьпяховае правядзеньне гэтай кампаніі.

Для правядзеньня масава-растлумачальнай работы мабілізавана 7 таварышоў з апарату саюзу, якія ўжо на кіраваны па арцелях раёну. Вызначаным таварышом праўленьне саюзу даручыла разгарнуць работу па арганізацыі новых утыльцэхаў на мясцох і да 15 сьнежня гэтага году забясьпечыць як колькаснае, так і якаснае выкананьне прамфінпляну IV кварталу першай пяцігодкі да 15 сьнежня гэтага году.

К.

Умацаваць фэрму

ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, падводзячы вынікі работы жывёлагадоўчых саўгасаў, адзначылі, што побач з буйнейшым ростам пагалоўя у некаторых мясцох мае месца вялікая безгаспадарчасьць, нездавальняючы дагляд за жывёлай, слабая арганізацыя працы, а ў сувязі з гэтым высокі адыход.

Практыка работы перадавых брыгад і фэрм сьвінасаўгасаў паказала, што пры ажыцьцяўленьні гэтых мерапрыемстваў, яны дамагліся значных посьпехаў у галіне сьвінагадоўлі. Зьлёт работнікаў фэрм, які нядаўна закончыўся, паказаў блізкучыя прыклады работы лепшых сьвінаводаў. Мы маем такія прыклады, калі Хількевіч—загадчык фэрмы і брыгадзір—Лаўрэцкая на працягу 3 месяцаў дамагліся захоўваньня 96 проц. маладняка.

Брыгадзір тав. Дзядзюля (саўгас Зялень), уключыўшыся ў конкурс на лепшага старэйшага сьвінара дамогся захаваньня 97.5 проц. пагалоўя і давёў вагу парасяці да часу адсадкі да 16 кілг.

Фэрма імя 8-га сакавіка (тав. Бела глаўская) таксама захоўвае 96 проц. пагалоўя. Фэрма Абчак (т. т. Манулік Яноўскі) мае таксама добрыя паказьнікі па захаваньні і гадаваньні сьвіней.

На зьлёце лепшых сьвінароў былі названы прозьвішчы Абухоўскай, Кункевіч, Кучак, Лаўрэцкай і іншых, якія зьяўляюцца сапраўднымі змагарамі за сацыялістычную сьвінагадоўлю. Гэтыя людзі паказалі, што пры жаданьні можна дамагчыся вялікіх посьпехаў у галіне фарсаваньня сьвінагадоўлі.

Здавалася-б, што такая роля фэрмы, камбінату, брыгады павінна была прыкаваць увагу дырэктароў, парт'ячэек, рабачкомаў, каб ператварыць фэрмы ў асноўны арганізацыйна-вытворчы апарат сьвінагадоўлі. Але што мы маем на справе?

Зьлёт са ўсёй яснасьцю выявіў, што фэрма яшчэ ня стала асноўнай арганізацыйнай вытворчай адзінкай саўгасу, што нават на лепшых з іх сьвінагадоўля ў поўнае выкананьне за дачы таварнай прадукцыі не пастаўлена ў цэнтры ўсяе практычнай работы. Трэба проста заявіць, што ўсе вялізарныя прарывы, безгаспадарчасьць у сьвінагадоўлі зьяўляюцца вынікам фармальнага падыходу да арганізацыі фэрм. Гэта мае месца ў фэрмах саўгасаў **Борні Бялевічы, «Зара Захаду», Курганаў, Замошша, Харомцаў** і г. д. Дзе ёсьць масавы адыход. Недапушчальным зьяўляецца такое становішча, што ў радзе саўгасаў («Пяцігодка», «Першае Мая», імя Молатава) фэрмам не аказваецца ніякай дапамогі з боку кіраўніцтва. Да апошняга часу ў радзе саўгасаў фэрмы ня маюць плянаў работ, фэрмы ня ведаюць усіх, зьмен у апладе сьвінароў за правядзеньне фарсаванага адкорму сьвіней, фэрмы не пераведзены на гаспадарчы разьлік, яны не атрымалі ўсіх сродкаў вытворчасьці. У гэтым прарыве вінавацы самы кіраўнікі фэрм, якія перапалі рыліся ў безадказных выкананьнях.

Такое становішча ў сьвіна-саўгасах зьяўляецца нязгарэмым, яно не гарантуе выкананьня плянаў у тэрмін аб здачы 41.445 тон мяса-сьвініны ў жывой вазе, якія вызначаны пастановай ЦК УсеКП(б) Менскаму сьвінаводу.

Барацьба за ўзмацненьне фэрм, на вышэйшае парсанальнай адказнасьці кіраўнікоў за вытворчасьць мяса ні ў якім выпадку не павінна паслабляць увагі да сьвінагадоўлі з боку дырэктароў. Гаддзеротт, з боку дырэктароў і тэхнічнага пэрсаналу саўгасаў патра буецца павышаная пэрсанальная ўвага да пытаньня сьвінагадоўлі.

Якія канкрэтныя вытворчыя задачы ставяцца з выключнай рэзкасьцю на даным этапе, каб плян у 41445 цэнтн. мяса быў выкананы як мінімальны? Патрабуецца, каб кожны станок, кожная матка былі запружаны максымальна. Трэба дамагчыся 100 процантнага правядзеньня злучкі, атрыманьня 100 процантнага апаросу. Неабходна поўнасьцю захаваць кожнае парася.

Сьвінасаўгасы могуць і павінны дамагчыся поўнага захаваньня маладняка, поўнага выкананьня плянаў по мясаздачы. Трэба толькі па-бальшавіцку ўзяцца за работу.

Т. Аўчыньнікаў

На барацьбу з прагуламі і цякучасьцю!

Намаганьнямі мільёнаў рабочых і сялян, ударнікаў сацыялістычнай індустрыі і калгасных палёў, працоўным гераізмам мас пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК на чале з тав. **Сталіным**, мы дабіліся нячуваных тэмпаў развіцьця народнай гаспадаркі.

У Савецкім Саюзе равняючыя посьпехі ня ніякай індустрыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі забясьпечваюць шпаркія тэмпы разгортваньня лёгкай прамысловасьці, развіцьця вырабу прадметаў шырокага ўжытку. Узросшыя патрэбнасьці рабочага забясьпечаньня зьвязаны з бесперапынным уздымам дабрабыту працоўных, ростам пакупнога попыту. Сярэдняя гадавая зарплата на аднаго працоўнага ўзрасла з 800 руб. у 1929 г. да 1.300 руб. у 1932 годзе. Апрача таго, фонд **сацыялізаванай зарплаты** даходзе ў бягучым годзе 4,3 мільярды рублёў і ў асноўным выдаткоўваецца на палепшаньне харчаваньня, здароўя і жыллёва-бытавых умоў працоўных. У нас поўнасьцю ліквідавана беспрацоўе, у выніку чаго ў вытворчасьць уцягнута ў значных размерах жаночая праца, павялічыўся паказьнік колькасьці працуючых членаў рабочай сям'і (1,53 замест 1, 23 у 1928 годзе).

Праўда, мы далёка не зрабілі яшчэ ўсяго таго, чаго можна і трэба дабіцца ў інтарэсах далейшага палепшаньня дабрабыту працоўнага рабочага. «Цяперашні рабочы, наш савецкі рабочы хоча жыць з шырокім цёнем усіх сваіх матар'яльных і культурных патрэбнасьцяй і ў сэнсе харчовага забясьпечаньня, і ў сэнсе жыльля, і ў сэнсе забясьпечаньня культурных і ўсякіх іншых патрэбнасьцяй». (Сталін).

Каб хутчэй узьняць дабрабыт рабочага яшчэ на большую вышыню, каб забясьпечыць патрэбнае разьвіцьцё тых галін прамысловасьці, якія непасрэдна працуюць на шырокі рынак, неабходна ў першую чаргу поўнасьцю выкайаць вызначаныя пляны выпуску прадукцыі як цяжкай, так і лёгкай прамысловасьцю.

Між тым чацьверты год пяцігодкі, які зьяўляецца адначасова базай для разгортваньня выкананьня другога пяцігадовага плану—плану пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва—характарызуецца невыкананьнем колькасных і якасных паказьнікаў у радзе галін прамысловасьці.

Дзе прычыны невыкананьня плянаў? Адной з асноўных прычын зьяўляецца **нячуваны рост прагулаў па няўважлівых прычынах і цякучасьць рабочай сілы.** Прагулы па няўважлівых прычынах па ніякай прамысловасьці БССР за 9 месяцаў 1932 году складаюць звыш 30.000 чалавека-дзён, па лёгкай прамысловасьці—звыш 80.000. Па радзе галін прамысловасьці 9 месяцаў 1932 году параўнаўча з тым-жа перыядам 1931 году характарызуюцца **ростам прагулаў.** Так, па заводах агульнага машынабудаўніцтва прагулы павялічыліся з 0,58 проц., да 1.19 проц., па МЭТЫЗ'у—з 0,68 да 0,80 проц., па цагельных—з 2,98 да 4,11 проц., па кажляных заводах—з 0,17 да 2,21 проц., па чараўлічных заводах—з 2,55 да 4,41 проц.

Прагулы па няўважлівых прычынах зьядаюць на сотні мільёнаў рублёў прадукцыі, якая вельмі неабходна нашай краіне, рабочаму спажыўцу. Тыя трудносьці, якія мы маем у сувязі з нячуваным ростам пакупнога попыту на тавары шырспажыву, яшчэ больш ускладняюцца тым, што прамысловасьць ня выконвае сваіх праміфінпляну.

Апрача таго, прагулы вельмі ад моўна адбіваюцца на матар'яльным становішчы тых груп рабочых, **якія па тэхналёгічным працэсе зьвязаны з прагульшчыкамі.** Напрыклад, **на гутах,** дзе кожны варштат яднае 7 чалавек, якія працуюць паводле строгага падзелу працы, нявыхад на работу аднаго-двух кваліфікаваных рабочых зрывае рабочы дзень усім іншым рабочым данага варштату. Рабочыя прымушаны пайсьці дамоў і атрымліваюць толькі сярэдні заработак, у той час, калі, будучы на зьдзельшчыне, атрымалі-б значна больш. На **швэйных фабрыках,** дзе работа ідзе па іспужжавай сыстэме (жывы канвэр), нявыхад на работу некалькіх чалавек зьнижае прадукцыйнасьць усёй істужкі, якая налічвае шмат людзей. Так, на Менскай фабрыцы «Кастрычнік» на другім агрэгаце 11 ліпстапада ня выйшла на работу 8 чал., якія дэзэртавалі без папярэджання. У сувязі з гэтым цэлыя **тры дні** істужка не змагла наладзіць нармальную работу. Гэтыя тры дні каштавалі сацыялістычнай прамысловасьці **200 польтаў,** а 220 рабочых і работніц істужкі недаатрымалі значнай часткі сваёй зарплаты.

Ня меншым злом для нашай прамысловасьці зьяўляецца **цякучасьць рабочай сілы.** Адсутнасьць беспрацоўя ў нашай краіне, недахват кваліфікаваных і нават некваліфікаваных рабочых стварацоць магчымасьць «пералёту» з аднаго прадпрыемства на другое. Няма амаль ні адной галіны прамысловасьці, якая была-б поўнасьцю ўкамплектавана рабочымі кадрамі. Некаторым галінам не хапае каля 20 проц. рабочых, якія прадугледжаны плянам.

У такіх умовах цякучасьць рабочай сілы **ўзмацняе недахват рабочых** (лятуны зафіксаваны ў разьездах), **зьнижае сярэдні ўзровень кваліфікацыі рабочых данага прадпрыемства,** бо пакуль новы рабочы прывыкае да свайго месца, авалодвае тэхнікай новага варштату, праходзіць значны час. А паасобныя прадпрыемствы сапраўды зрабіліся праходным двором.

Так, на заводзе **імя Варашылава** (Менск) за 9 месяцаў прыбыла 346 рабочых, а выбыла 707 рабочых, або 47,5 проц. агульнай колькасьці рабочых на заводзе.

На гомельскім заводзе, «Пралетары» за той-жа час прыбыла 360 чалавек, а звольнілася 692, або 61,5 проц.

На **Гомсельмашы** прыбыла 1.322 ч., звольнілася 1.403, або 90,8 проц. в г. д.

Зусім ясна, што пралетарская дзяржава ня можа ў далейшым цярпець ладобных абгіднасьцяй. Вялізарныя задачы, што стаяць перад Савецкім Саюзам, патрабуюць **ад усёй рабочай клясы, ад усіх працоўных** жалезнай працадысцыпліны, найбольш поўнага скарыстаньня кожнага рабочага дня, кожнай рабочай гадзіны. Мільёны энтузіястаў сацыялістычнай будоўлі на базе сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарництва змагаюцца за свае буйлучшае, перамагаючы гігантыя перашкоды, якія засталіся ў спадчыну ад старога ладу. Прагульшчыкі і лятуны ўскладняюць гэтыя перашкоды, працуючы на руку клясаваму ворагу.

Таму пастанова ЦВК і СНК СССР і БССР «Аб звальненьні за прагул без уважлівых прычын» мае выключна вялікае значэньне для ўзьнацьця дысцыпліны на фабрыках, заводах і ва ўстановах. Апрача таго, паводле паведамленьня «Праўды», будзе выдана пастанова аб пашырэньні функцый заводаправяўніцтваў у галіне забясьпечаньня рабочых і аб зьмене картачнай сыстэмы.

Ня трэба даводзіць, якое вялікае значэньне будуць мець гэтыя мерапрыемствы на ўпарадкаваньне забясьпечаньня рабочых і працдысцыпліны. Да гэтага часу прагульшчыкі і лятуны месяцамі атрымлівалі харчы і прамтавары так, як і працаўныя. Ажыцьцяўленьне новай сыстэмы забясьпечаньня на двух харкаўскіх прадпрыемствах выявіла больш 10.000 «мертвых душ», якія толькі лічыліся ў сьпісах ЗРК, а сапраўды на заводах не працавалі. Аслабаненьне прадпрыемства ад гэтых дармаедаў ня толькі ўпарадкавала сыстэму забясьпечаньня, але **дало магчымасьць лепш забясьпечваць сапраўдных ударнікаў і адданых справе рабочае клясы рабочых за кошт эканоміі лішкаў прадуктаў.**

Рабочыя беларускіх прадпрыемстваў у сваіх рэзалюцыях вітаюць і падтрымліваюць пастанову ўраду і бяруць на сябе абавязацельствы змагацца за сацыялістычныя адносіны да працы.

Вось што гаворыць беспартыйны рабочы заводу імя Варашылава тав. **Мытнік:**

— Таварышы, я лічу, што прагулы, гэта язва на целе сацыялістычнага прадпрыемства. Гэту язву трэба выпальваць. За пастанову, пра якую нам тут даклалі, трэба ўзяцца абедзьвюма рукамі і, звальняючы прагульшчыкаў з нашага заводу, трэба зрабіць так, каб яны нідзе не змаглі працаваць. Што датычыць мяне, дык я буду правяраць, чаму мае таварышы па варштаце ня прыходзяць на работу...

Работніца 2-га, апрэгату швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» тав. **Чартон** заявіла:

— Пастанова ўраду зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам па ўмацаваньні працоўнай дысцыпліны. Ва ўмовах нашай фабрыкі, дзе ўведзена паточная сыстэма, прагулы ня толькі б'юць па прамфінпляне, але і па зарплаце адданых справе рабочых, якія прымушаны рабіць простой з-за непадачы дэталяй па канвэеры.

Рабочы заводу **«Камунар»** гаворыць:

— Ёсьць такія злосныя прагульшчыкі, якія ў рабочы час замест таго, каб стаяць каля варштату, стаяць у чарзе, а потым спекулююць атрымаными прадуктамі.

Пастанова ўраду правільная. Злосных лятуноў і прагульшчыкаў, якія карысталіцца недахватам рабочай сілы, трэба звальняць і высяляць з кватэры.

Перадавыя рабочыя не абмяжоўваюцца аднымі заявамі і рэзалюцыямі. Сьледуючы слаўным традыцыям рабочай клясы Савецкага Саюзу, якая на кожную новую трудносьць адказвае канкрэтнымі справамі, рад фабрык і заводаў прымае на сябе абавязацельства па ўзьнаўленьні прадукцыйнасьці працы, ліквідацыі браку, выкананьні плянаў і г. д.

Дэлегаткі менскай абутковай фабрыкі ўзялі на сябе абавязацельствы не рабіць ні аднаго прагулу, выканаць праміфінплян, праводзіць растлумачальную работу сярод работніц, якія спазьняюцца на работу, выяўляць злосных прагульшчыкаў па цэхах.

Брыгады капалёчнага цэху фабрыкі «Усход» заключылі сацдагаворы, паводле якіх яны абавязваюцца ліквідаваць прагулы, выяўляць і выкрываць прагульшчыкаў і г. д.

У гэтых канкрэтных абавязацельствах ударнікаў—лепшае адлюстраваньне таго, як рабочая клясы спатакала новы дэкрэт аб барацьбе з прагуламі. Гэтыя абавязацельствы маюць вялікае палітычнае значэньне і кажуць аб тым, што з прагуламі і лятунствам, як і з іншымі труднасьцямі, што стаяць на нашым шляху, мы справімся.

Зразумела, што злосны прагульшчык, лутун-прафсаюзнік не здаволен пастановай ўраду аб барацьбе з прагуламі.

Не адважваючыся адкрыта выступаць супроць дэкрэту, злосныя прагульшчыкі, якія падпас зьяўляюцца клясава-чужым элементам дзейнічаюць пашэпкаму.

Вось на заводзе імя Варашылава раб

Заслаўскі раён атрымлівае пераходны сьцяг НКФ БССР

Сацыялістычныя мэтады ў фінансавай рабоце Заслаўшчыны--перадаць усім раёнам

Да ўсіх рабочых, калгасьчікаў, беднякоў і сераднякоў, да ўсіх рабселькораў ніз вога і рённага друку БССР

Рабочая кляса ў саюзе з працоўным сялянствам, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, з вялізарнейшымі посьпехамі заканчваюць першую пяцігодку і мабілізуюць усю энэргію на пасьпяховае выкананьне другой пяцігодкі,—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Вялізарныя посьпехі ў нашай краіне здабыты ў выніку бальшавіцкага кіраўніцтва ленінскай партыі, вялікага ўладыму мас—ударніцтва і сацспаборніцтва і жорсткай барацьбы з клясавым ворагам і яго агентурай—правымі і «левымі» апартуністамі.

Узняты працоўнымі масамі лёзунг — выканаць пяцігадовы плян сацыялістычнага будаўніцтва за 4 гады,—ня толькі выкананы датэрмінова, але і перавыкананы.

У выкананьні задач 3-га рашаючага і 4-га заключнага году пяцігодкі, Заслаўшчына, якая знаходзіцца на мяжы з загніваючай фашысцкай Польшчай, дабілася буйных посьпехаў у барацьбе за сацыялізм.

Шырока разгортваючы масавую работу, ударніцтва і сацспаборніцтва, Заслаўшчына была ў першых радох раёнаў БССР у 3-м рашаючым годзе па выкананьні асноўных гаспадарча-палітычных задач. У 4-м заключным годзе пяцігодкі Заслаўшчына не здала запятага месца, а яшчэ больш замацавалася на перадавых пазіцыях.

Надыходзячы пленум ЦК КП(б)Б Заслаўскі раён сустракае выкананьнем плану мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу на 110,7 проц., у тым ліку па добраахвотных плацяжох—на 106,1 пр., выкананьнем гадавога плану мабілізацыі сродкаў на 122,6 пр. плану рэалізацыі акцый Трактарцэнтру — на 130, квартальнага плану па ўкладах у ашчадкасу--на 421 і гадавога--на 185,9%; выкананьнем заданьняў па рэалізацыі пазык: 4-га заключнага году першай пяцігодкі—на 111%; выкананьнем плану адгрузкі бульбы пралетарыяту гораду Леніна на 111 проц.

Заслаўскі раён зьяўляецца першым у БССР па выкананьні плану мясазагатовак (квартальны плян выкананы на 78 проц.), набліжаецца да выкананьня плану збожжазагатовак; актыўна разгарнуў работу на разгортваньні двухмесячнага паходу за пырспажыў; школамі ахоплена 98,2 проц. дзяцей школьнага ўзросту, вячэрнімі пачатковымі палітэхнічнымі школамі для дарослых і лікпунктамі ахоплена 84 проц. усяго працоўнага насельніцтва раёну.

Раён у цэлым і сотні яго ўдарнікаў—лепшыя змагары за сацыялізм—неаднаразова ўзнагароджаны. Раён трымае на працягу 3-х кварталаў пераходны чырвоны сьцяг НКФБ і ЦК ЛКСМБ; зараз раён атрымлівае гапаровы пераходны чырвоны сьцяг НКФ БССР і ЦП саюзу ФБР. На працягу году раён браў на прамаўжкі буксір 4 адстаючых раёны БССР.

Гэтых посьпехаў мы дабіліся ў выніку няўхільнага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі, шырокага разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы. Па раёне разьвіваецца і пераходзіць з савегу ў савет гапаровы пераходны чырвоны сьцяг РВК. Тры калгасы заваёўваюць чырвоныя пераходныя сьцягі мясцовых арганізацый. У раёне—па калгасах, саўгасах, вёсках, сельсаветах і мясцовых арганізацыях ёсьць чырвоныя і чорныя дошкі са сьпісамі лепшых з лепшых ударнікаў і асобна—пратуляшчыкаў, лодыраў і разгільдзяеў.

Адстаючыя атрымліваюць асобыя «узнагароды» — рагожныя сьцягі і рагожныя партфэлі.

У выніку гэтай масавай работы колькасьць ударнікаў усё больш узрастае, а колькасьць разгільдзяеў, пратуляшчыкаў зьмяншаецца.

Адну з рашаючых роляй у гэтых посьпехах адыграла ўзбраеньне марксыцка-ленінскім выхаваньнем партарганізацыі, шырокая прапаганда, агітацыя і сацыялістычнае перавыхаваньне рабочых, працоўных, калгасных мас раёну. Да канца 4-га заключнага году пяцігодкі калгасы Заслаўскага раёну, якія аб'ядноўваюць 71 проц. бядняцка-сераднякіх гаспадарак, ператварыліся ў моцныя сацыялістычныя адзінкі.

Пры разьмяркаваньні ўраджаю калгаснікі, беднякі і сераднякі працоўныя аднаасобнікі пераканаліся ў тым, што ў сацыялістычнай гаспадарцы яны атрымліваюць больш прыбытку, чым у аднаасобнай. У выніку—мы зарамаем новы прыліў беднякоў і сераднякоў у калгасы.

Перадаючы вопыт і мэтады сваёй работы, мы заклікаем працоўных БССР:

1) Да 15-га сьнежня выканаць і перавыканаць плян мабілізацыі сродкаў 4-га кварталу і гэтым самым дабіцца звароту ў БССР страчанага чырвонага гапаровага сьцягу НКФ СССР.

2) Калгаснікам, беднякам і сераднякам-аднаасобнікам зрабіцца актыўнымі ўкладчыкамі ашчадных кас, у якіх захоўваць усе свае вольныя грашовыя сродкі.

3) На працягу сьнежня арганізаваць ва ўсіх калгасах і вёсках БССР сталыя кансультацыі, дапамогу калгаснікам і аднаасобнікам у праверцы выйгрышаў па дзяржпазыках.

4) Прымаючы на сябе абавязак да 1-га сьнежня г. г. поўнасьцю выканаць плян мясазагатовак IV кварталу і да 10 сьнежня плян збожжазагатовак,—заклікаем усе раёны БССР выканаць гэтыя пляны не пазьней, як да 10-га сьнежня гэтага году.

5) Да 1-га сьнежня цалкам выканаць пляны адгрузкі бульбы пралетарскім цэнтрам і пляны бульбазагатовак наогул;

6) Да 1-га студзеня поўнасьцю выканаць пляны загатовак па ільну-валакне і іншых відах загатовак;

7) Шырока разгарнуць і пабальшавіцку правесьці двухмесячны паход сэкцый і дэпутацкіх груп саветаў за пырспажыў;

8) Да 1-га сьнежня забясьпечыць 100-процантны ахоп школамі дзяцей школьнага ўзросту, ма лапісьменных і няпісьменных; ліквідаваць прагулы ў школах і выпадкі другагодніцтва, увесьці плян навасьць у рабоце школ; арганізаваць гарачыя сьнеданьні і пасці тэхнічныя пакоі, забясьпечыць усе школы аналам. На аснове рэалізацыі пастаноў партыі і ўраду аб школе і папулярызацыі іх сярод шырокіх колаў працоўных —забясьпечыць узнімаюцца якасьці працы школ, поўную і сталую прапрацоўку ўсяго праграмнага матар'ялу.

9) Да 15-га сьнежня поўнасьцю засыпаць пасенныя фонды ў калгасах па ўсіх відах культур.

10) Да пачатку веснавой сяўбы 1933 г. скончыць гаспадарчае землеўпарадкаваньне калгасаў і ўвядзеньне севазвароту (складаньне пераходных таблиц), забясьпечыць веснавую сяўбу цягавай сілай, гаспадарчае адносіцца да каня і ліквідаваць абязьлічку.

Гэтымі абавязацельствамі забясьпечым поўнае выкананьне плянаў 4-га заключнага году першай пяцігодкі і тэтым створым усе ўмовы для пасьпяховага ажыцьцяўленьня плянаў пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

На даручаньні калгасьнікаў Рогайскага, Слабодзкага, Шаршунскага і Новадворскага нацыянальна-польскага сельсавету, калгаснікаў калгасу *«Чырвоная варта»*, імя *Дзяржынскага*, імя *Розы Люксэмбург*, *«Пяцігодка»*, *«Герой працы»* (дзе 55 подпісаў).

Умовы ўсебелаўскага конкурсу друку на лепшую работу газэт па ўдзеле ў выкананьні фінпляну IV кварталу

Надаючы выключнае палітычнае значэньне своячасоваму і поўнаму выкананьню пляну мабілізацыі сродкаў IV кварталу і ўсяго 1932 г., рэдакцыя газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» разам з НКФ БССР, ЦП саюзу фінбанкаўскіх работнікаў рэдакцыямі газэт: «ЗЬВЯЗДА», «РАБОЧИЙ», «РАБСЕЛЬКОР», «КАЛГАСЬНІК БЕЛАРУСІ», «АКЦЯБР», «ОРКА» ўключаюцца ва ўсесаюзны конкурс на лепшую работу газэт у справе садзейнасьці выкананьню фінпляну IV кварталу і ўсяго 1932 году і ў сваю чаргу абвяшчаюць адпаведны ўсебеларускі конкурс нізавога друку.

Конкурс пачынаецца з 29-га лістапада 1932 году і працягнецца па 1-ае лютага 1933 году.

Абвешчаны конкурс павінен зьявіцца баявым аглядам агітацыйна-масавай работы цэнтральнага і нізавога друку БССР за выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, барацьбе за лепшае большае ўцягненьне ў фінработу шырокіх мас фінактыву—рабочых, калгаснікаў, працоўных аднаасобнікаў, рабселькораў і ўсяго савецкага актыву гораду і вёскі, аглядам мэтадаў барацьбы друку за фінплян, барацьбой за падвышэньне ролі друку ў выкананьні фінпляну, адным з мэтадаў барацьбы за зварот у IV квартале страчанай БССР пачэснай узнагароды—гапаровага пераходнага сьцягу НКФ Саюзу ССР і ЦК саюзу ФБР.

Асноўнымі задачамі (а такім чынам і паказьнікамі для ацэнкі работы ўдзельнікаў конкурсу) зьяўляюцца: арганізацыя масавай работы вакол выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва па ўсіх відах плацяжоў і паступленьняў, да ходу ад аграмаджанага сэктару, сыстэматычнае асьвятленьне ходу выкананьня гэтых плянаў, выяўленьне прычын адставаньня, паказ лепшых раёнаў, падцягваньне, арганізацыя абмену вопытам спаборніцтва, газэтных буксіраў, выязных рэдакцый і г. д.

Барацьба за хутчэйшае завяршэньне рэалізацыі пазыкі «чацьвертага завяршаючага», асабліва па вёсцы, сыстэматычнае асьвятленьне ходу рэалізацыі, арганізацыя спаборніцтва раёнаў, прадпрыемстваў і г. д., барацьба за палепшаньне абслугоўваньня пазыкатрымальнікаў і ўкладчыкаў.

Барацьба за захаваньне рэвалюцыйнай законнасьці . ў фінансавай рабоце, арганізацыя бюро скаргаў, сувязь з органамі РСІ і пракуратурай, расьледваньне па допісах працоўных, барацьба за дзейнасьць рабселькораўскіх заметак і г. д.

Сыстэматычны нагляд за работай фінорганаў з нізавым актывам, дапамога ім у гэтай справе і арганізацыя работ з фінактывам пры рэдакцыях газэт, скліканьне зьлётаў, нарад, стварэньне кансультацый па паасобных пытаньнях фінансавай работы.

Удзел у конкурсе за лепшую фінансавую сэкцыю саветаў па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў, асьвятленьне ходу конкурсу, дапамога фінсэкцыям у правядзеньні гэтай работы і г. д.

Удзел у конкурсе за лепшую сельскую культасьветустанову па арганізацыі масавай работы вакол выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, удзел у конкурсе ЦК камсоду БССР за лепшы камсод, удзел у месячніку агляду фінансавай работы прафсаюзу, які абвешчаны зараз па лініі ЦСПСБ.

Для прэм'яваньня лепшых газэт і паасобных газэтных работнікаў па ўсесаюзным конкурсе асыгнавана 200 тыс. руб., з якіх 150 тыс. руб. на прэм'яваньне газэт і 50 тыс. руб. на індывідуальнае прэм'яваньне работнікаў друку. Пры гэтым у дадатак да вызначаных пры ўсесаюзным конкурсе сум вызначаецца рэспубліканскі фонд ў 15 тыс руб. для прэм'яваньня удзельнікаў усебеларускага конкурсу—цэнтральных і раённых газэт і фабрычна-заводзкіх шматтыражак і паасобных работнікаў друку.

Прэм'яваньне праводзіцца цэнтральнай конкурснай камісіяй БССР па атрыманьні матар'ялаў з месц (зьвесткі аб уключэньні ў конкурс, мерапрыемствы па правядзеньні конкурсу на мясцох, зводкі аб ходзе конкурсу і інш.). Цэнтральная конкурснай камісіяй БССР газэты, якія паказалі лепшыя ўзоры працы па правядзеньні конкурсу, прадстаўляюцца да ўдзелу ва ўсесаюзным конкурсе.

Пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» працуе ўсебеларуская конкурсная камісія ў складзе прадстаўнікоў: газэты «Савецкая Беларусь»—пад старшынствам рэдактара газэты тав. Шестакова, газэты «Зьвязда», «Рабочий», «Акцябр», «Рабселькор», «Орка», «Калгасьнік Беларусі», НКФ БССР, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, Саюзу ФБР, ЦКамсоду, Калгасцэнтру і Белкапсаюзу.

Уключыўшыся ў конкурс, усе цэнтральныя, раённыя, фабрычна заводзкія газэты, паведамляюць аб гэтым ўсебеларускую цэнтральную конкурсную камісію не пазьней 10-га сьнежня 1932 г.

Цэнтральная конкурсная камісія знаходзіцца пры рэдакцыі газэты «Савецкая Беларусь» (Менск, Пляц волі, 17), куды і належыць зьвярнуцца з усімі даведкамі па гэтым конкурсе.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КОНКУРСНАЯ КАМІСІЯ.

Збожжазагатоўкі

Зрабіць упор на масавую работу сярод працоўных аднаасобнікаў

«в) выкананьне пляну збожжазагатовак з ураджаю 1932 году закончыць не пазьней 1-га студзеня 1933 г.; г) стварэньне насенных фондаў у калгасах закончыць не пазьней 15 студзеня 1933 г.; д) прызнаць мэтазгодным пасьля сканчэньня выкананьня збожжазагатоўчага пляну і ўтварэньня насенных фондаў, г. зн. з 15 студзеня 1933 г прадставіць калгасам і калгаснікам поўную магчымасьць бесьперашкоднага продажу лішкаў свайго збожжа на свой погляд як на рынках і базарах, так і ў сваіх калгасных крамах, абавязаўшы мясцовыя органы і ўлады аказваць у гэтым калгасам і калгаснікам поўную садзейнасьць і прыняць меры да выкарчоўваньня прыватнікаў і перакупшчыкаў-спэкулянтаў, якія спрабуюць нажыцца на калгасным гандлі» (СНК СССР—ЦК УсеКП(б).

Рагачэўшчына яшчэ не дамаглася пералому

РАГАЧЭЎ. (Ад наш. кар.) Аднаасобны сэктар РАГАЧЭЎСКАГА РАЁНУ ў 1932 г. павінен загатовіць 1.100 тон добраякаснага збожжа. Гэта задача вялікай гаспадарча-палітычнай важнасьці, і пасьпяхова ажыцьцявіць яе магчыма толькі пры тэй умове, калі вакол збожжазагатовак будзе разгорнута самая шырокая масава-растлумачальная работа сярод бядняцка-сераднякай часткі аднаасобнікаў пры ўмове бязьлітаснай барацьбы з кулацтвам, шляхам штодзеннага кіраўніцтва збожжазагатоўкамі з боку партячэек—сельсаветаў і загатоўчага апарату.

Ці маем мы гэта на Рагачэўшчыне? На справе як-раз адваротнае. Аб гэтым красамоўна сьведчаць факты.

На 25-XI плян здачы (продажу) дзяржаве збожжа па аднаасобным сэктары выкананы толькі на 55,3 проц. За пацідзённу з 20 на 25 лістапада прырост у выкананьні пляну складае 1,2 проц. З пяцідзённі ў пяцідзённу тэмпы збожжазагатовак у аднаасобным сэктары ня толькі не павялічваюцца, а, наадварот, ганебна зьніжаюцца.

Віна тут падае ня толькі на партячэйкі, якія ня гледзячы на неаднаразовыя сыгналы раённага і цэнтральнага друку ў большасьці сваёй бязьдзейнічаюць; значная доля віны падае і на сельсаветы цалкам і на іх аднаасобных членаў. Вось, напрыклад ГАРАДЗЕЦКІ сельсавет. Аднаасобны сэктар гэтага сельсавету плян выканаў прыблізна на 40 проц. А члены сельсавету бязьдзейнічаюць. Член сельсавету вёскі Ветачка—МЕЛЬНІКАЎ РЫГОР мае таго, што не праводзіць ніякай масавай работы сярод працоўных аднаасобнікаў свайго вучастку, але нават сам ня выканаў сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажы) збожжа. Член сельсавету вёскі Царкоўе ЖУКАЎ таксама ўвесь час не праводзіць работу сярод беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў па збожжазагатоўках. Нічога дзіўнага пасьля гэтага, што вёска Царкоўе і Ветачка зьяўляюцца найбольш адсталымі ў Гарадзецкім сельсавеце, яны цягнуцца ў хвасьце збожжазагатоўчай кампаніі. Як-раз адваротнае па тых вёсках, дзе члены сельсавету працуюць добра. Так, у вёсцы КАЦЯРЫНАПОЛЬЛЕ, дзе член сельсавету актыўны і энэргічны працаўнік тав. КАРНЕЕЎ ПЯТРО, плян збожжазагатовак выкананы цалкам. Серадняк гэтай вёскі КОНЧЫЦ ЯНКА здаў (прадаў) дзяржаве 65 клг. збожжа замест 44 клг. якое ён абавязаўся здаць па кантрактацыі. Паасобныя беднякі і сераднякі вёскі ГАРАДЗЕЦ таксама перавыканалі свае самаабавязацельствы па здачы (продажы) збожжа дзяржаве. Вось напрыклад бедняк ГАВЯДКОЎ ЯКУБ здаў 147 клг. збожжа замест 67; ІСАКАЎ ЯГОР здаў замест 92 клг.—113 клг.; БАРАНАЎ ПЯТРО па самаабавязацельстве павінен быў здаць (прадаць) 44 клг., а здаў 64. Усё гэты вынік узорнай работы членаў сельсавету пад кіраўніцтвам мясцовай партячэйкі.

У раёне ёсьць шмат такіх сельсаветаў, дзе пляны збожжазагатовак стаяць пад пагрозай зрыву. Так, аднаасобны сэктар КУРГАНСКАГА сельсавету плянавае заданьне па збожжы выканаў толькі на 33,1 проц. (на 25-XI), М—СТРАЛКОЎСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ—на 37,1 проц., ПРЫБОРСКАГА—на 40,5 проц., СТАНЬКАЎСКАГА—39 проц., ЗБАРОЎСКАГА—39,3 проц., МЯРКУЛАВІЦКАГА—41,6 проц. і г. д. Тут члены сельсавету, як і наогул усе сельсаветы на чале з партячэйкамі, працуюць у гэтай галіне дрэнна.

Надаўна на старонках газэты «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» сыгналізавалася аб недапушчальна ганебных тэмпах збожжазагатовак на Рагачэўшчыне. Але партарганізацыя не забясьпечыла рашучага пералому ў рабоце па збожжазагатоўках. Характарны прыклад: за пяць дзён лістапада (з 20 лістапада па 25) прырост у выкананьні агульнага-раённага пляну збожжазагатовак складае толькі 0,8 проц. (на 25-XI раённы плян выкананы на 62 проц.), у той час, як за папярэднюю пяцідзённу прырост быў у два разы больш 1,5 проц.).

Прарыў у збожжазагатоўках па РАГАЧЭЎСКІМ раёне штодня паглыбляецца.

Партарганізацыя РАГАЧЭЎШЧЫНЫ, сельсаветы, камсамол, увесь загатоўчы апарат абавязаны зараз як ніколі ўзмацніць масавую работу вакол збожжазагатовак сярод працоўных аднаасобнікаў, перанесьці лепшыя ўзоры работы перадавых членаў сельсавету ў адстаючыя сельсаветы, дабіваючыся 100 проц. выкананьня дзяржаўных пляноў збожжазагатовак у бліжэйшыя дні. Трэба ўвесь актыў раёну, які працуе па бульбаадгрузцы, у сувязі з выкананьнем пляну адгрузкі бульбы, зараз-жа перакінуць на зьвяртэнь не збожжазагатовак у аднаасобным сэктары.

КУЛЯШОЎ ХВЕДАР.

Раёчны друк у барацьбе з фінплян

Заслаўшчына на працягу некалькіх кварталаў перавыконвае плян мабілізацыі сродкаў. Плян IV кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі выкананы на 103 проц., плян I кварталу 4-га заключнага году пяцігодкі выкананы на 108 проц., II квартал—на 134 проц., III квартал — на 166 проц., і IV квартал 4-га заключнага году пяцігодкі на 15-XI-32 г. выкананы на 103,2 проц.

Газэта «Камунар Заслаўшчыны», ні завы друк і рабселькоры ў справе мабілізацыі працоўных мас раёну на выкананьне фінпляну аддаюць шмат увагі. У сваёй практычнай рабоце «Камунар Заслаўшчыны» сыстэматычна з нумару ў нумар цесна ўвязвае работу мабілізацыі сродкаў з іншымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі, ась вятляе ход мабілізацыі сродкаў насельніцтва, даючы разгорнуты паказ яго, паказвае лепшых ударнікаў фінфронту і мэтады іх работы.

Паказваючы рад перадавых сельсаветаў і калгасаў, мы бязьлітасна білі па зрыўшчыках фінпляну.

На старонках «КЗ» мы зьмяшчалі чырвоную і чорную дошкі перадавікоў і зрыўшчыкаў; зводкі чорных дошак, мы давалі прозьвішчы старшынь сельсаветаў і кіраўнікоў устаноў, якія зрываюць фінплян, што мабілізавала ня толькі кіраўнікоў, але і ўвесь актыў на поўнае і своячасовае выкананьне фінпляну. Напрыклад, калі за гаварылі на старонках «К.З.» аб прарыве ў выкананьні фінпляну па Рагоўскім сельсавеце, дык сельсавет ня толькі выканаў, але і перавыканаў плян Рагоўскі сельсавет дабіўся таго, што з кварталу ў квартал перавыконвае пляны мабілізацыі сродкаў. Гэты сельсавет выканаў плян у III квартале на 149,1 проц. плян IV кварталу на 20-XI —па 73,1 проц.

Газэта шырока разгарнула кампанію па рэалізацыі пазыкі 4-га завяршаючага году пяцігодкі. Былі праведзены куставыя зьлёты рэдактароў насьценгазэт і рабселькораў. Газэта паказала канкрэтна саўгас, калгас, брыгаду; вёску і паасобных калгаснікаў, рабочых, служачых і беднякоў-сераднякоў-аднаасобнікаў, якія прымаюць удзел у рэалізацыі пазыкі. Праведзены рэйды рабселькораў, выпускаліся спэцыяльныя макеты па рэалізацыі пазыкі, і г. д. У выніку праведзенай работы пазыка «4-га рашаючага году пяцігодкі» рэалізавана сярод рабочых і служачых на 111 проц., па калгасах—на 101,5 і па неарганізаваным насельніцтве — на 113. Разам па раёне плян рэалізацыі пазыкі выкананы на 109 проц.

Пры дапамозе і непасрэдным удзеле рэдакцыі было праведзена некалькі зьлётаў ударнікаў і рэйдаў па пытаньні выкананьня фінпляну IV кв.

Мы на дасягнутых посьпехах у мабілізацыі сродкаў не супакоіліся. Пад кіраўніцтвам КП(б)Б будзем мабілізоўваць працоўныя масы раёну на далейшае разгортваньне работы па мабілізацыі сродкаў насельніцтва. Будзем змагацца за далейшае перавыкананьне фінпляну па раёне. Быкашоў.

Апартуніст Чэркес—старшыня Дзяковіцкага сельсавету выключаны з радоў партыі

СТАРОБІН. Ход збожжазагатовак па раёне нездавальняючы. Тэмпы загатовак за апошнія дні зьніжаліся. Некаторыя сельсаветы, узяўшыся за выкананьне бульбазагатовак, зусім спынілі загатоўку збожжа і за гэты час ніводзін цэнтнэр збожжа не адпраўлены на станцыю Слуцк. Старшыня сельсавету ЛАЗОЎСКІ ніякіх мер не прадпрыняў, каб збожжа не застава лася ў глыбінных пунктах.

ЧЫРВОНА-ДВОРСКІ сельсавет зьяўляецца рашаючым у збожжазагатоўках па раёне. Але кіраўніцтва гэтага сельсавету замест мабілізацыі мас на пасьпяховае выкананьне збожжазагатовак, разгортваньне масавай работы, занялося адміністраваньнем, масавымі вобыскамі ў сялян сераднякоў.

Апартуністычную бязьдзейнасьць да загатовак праявіў старшыня ДЗЯКОВІЦКАГА СЕЛЬСАВЕТУ ЧЭРКЕС. Ён адкрыта заяўляе: «ні збожжазагатоўкі, ні бульбазагатоўкі сваёй сельсавеце ня выканаю». Бюро РК і прэзыдыум РК КП(б)Б зьнялі апартуніста ЧЭРКЕСА з работы, выключыўшы яго ў радоў партыі. БЕЛТА).

Вопыт пераможцаў

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта)

Хто з нас забудзе крывавы час 1920 году калі Савецкая Беларусь была пакрыта шыбеніцамі, на якіх былі павешаны сотні і тысячы рабочых і сялян БССР..

Хто забудзе тыя адзінаццаць месяцаў, калі нашыя гарады мястэчкі і вёскі гінулі ў полымі пажараў, а з воды і фабрыкі ператварыліся ў груды мёртвых абсыпаных попелам руін. Хто забудзе загад, адданы азьвярэлым генэралам у часе адступленьня белапольскай арміі — «спаліць усю Беларусь».

І нашу краіну палілі, разбуралі, раўнялі з зямлёй. Буйнейшыя прамысловыя цэнтры Савецкай Беларусі былі абстрэлены, узарваны і спалены. Ты сячы пралетараў і сялян загінулі ў турмах на шыбеніцах і пад шашпалямі. Колькі ахвяр, хіба іх пералічыш? Загад «спаліць усю Беларусь» зьяўляецца сымбалем белапольскай акупацыі, якая ўсюды пакідала пасьля сябе, мора крыві, горы трупаў і руіны вёсак мястэчак і гарадоў.

Мястэчка Заслаўе не ўнікла гэтайжа долі, сьмерць і разбурэньне—вось што станавіла сабой апошняе. Але мы перамаглі. На заклік нашай партыі ўсе рабочыя і сяляне краіны Саветаў, зьнітаваныя клясавай нянавісьцю да ворага ўзьняліся супроць акупантаў. Пралетары БССР, на чале з камуністычнай партыяй, пры брацкай дапамозе працоўных усёй Савецкай краіны, разьбілі ўшчэнт ланцуг белапольскай акупацыі. Наша адважная Чырвоная армія прагнала з нашай зямлі акупантаў, вызваліўшы Савецкую Беларусь з-пад панскага боту.

Прайшло 12 год самаадданай бальшавіцкай барацьбы і зноў адноўлены арўінаваныя гарады, мястэчкі і вёскі. Шпаркімі тэмпамі ўзрастае прамысловасьць і разам з ёй узрастае камунальная гаспадарка. З кожным годам паляпшаюцца матарыяльна-бытавыя ўмовы рабочых і дабрабыт працоўных. БССР з краіны аграрнай зробілася індустрыяльна-аграрнай і на аснове шпаркага разьвіцця індустрыялізацыі падведзена магутная тэхнічная база пад сельскую гаспадарку. Рашуча і бязьлітасна, на аснове суцэльнай калектывізацыі, ліквідуецца апошняя апора капіталізму на вёсцы —кулацтва, як кляса.

Гэтыя вялізарныя дасягненьні БССР магчымы толькі таму, што на чале сацыялістычнага і культурнага будаўніцтва стаіць камуністычная партыя, што БССР знаходзіцца ў цесным саюзе з брацкімі Савецкімі рэспублікамі і карыстаецца шырокай дапамогай з боку ўсяго Саюзу.

***

На стыку двух сьветаў—заходняй мяжы Савецкага Саюзу, фарпостам стаіць невялікае мястэчка Заслаўе. На першы погляд ціхае, спакойнае, быццам у ім нічога не адбываецца... А на справе ў гэтым скромным мястэчку бурліць кіпучае жыцьцё. Адбываецца сацыялістычная будоўля як і ва ўсім Савецкім Саюзе.

У цэнтры мястэчка стаіць прыгожы прасторны домік, на ім шыльда: «Заслаўскі РК КП(б)Б».

Гэта—мясцовы штаб сацыялістычнага будаўніцтва Заслаўскага раёну.

У любы час у гэтым штабе можна бачыць мястовага чалавека сярэдняга росту. У яго строгі твар абрамлённы чорнымі брывамі; з-пад іх выглядаюць разумныя шэрыя вочы. Гэта тав. **Кудзельскі**, сакратар раённага камітэту партыі.

Умелым бальшавіцкім кіраўніцтвам ён заваяваў моцны аўтарытэт сярод працоўных свайго раёну. Сам рабочы з багатым рэвалюцыйным мінулым ён на справе праводзіць у жыцьцё генэральную лінію партыі.

Заслаўскі раён зьяўляецца перадавым раёнам па выкананьні ўсіх гаспадарча - палітычных кампаній, якія высоўваюцца партыяй і ўрадам. На сёнешні дзень раён стаіць у першых радох па збожжазагатоўках, мясазагатоўках, адгрузцы бульбы Ленінграду і мабілізацыі сродкаў. На працягу ляпі кварталаў ён кварталу ў квартал раён перавыконвае свае заданьні па мабілізацыі сродкаў. На 15 лістапада фінплян IV кварталу раён выканаў на 102,3 проц., а па добраахвотных плацяжох—на 99,2 проц. За сваю ўдарную работу на фінансавым фронце Заслаўскі раён атрымаў пераходны чырвоны сьцяг Наркамфіну БССР і на працягу трох кварталаў камсамольская арганізацыя з гонарам утрымлівае пераходны сьцяг ЦК ЛКСМБ. Зараз раён прэміраваны за перавыкананьне свайго сацыялістычнага абавязацельства, — да Кастрычніцкіх сьвят выканаць 50 проц. квартальнага пляну

Цікаўлюся вопытам фінансавай работы Заслаўскага раёну.

— Скажэце, тав. Кудзельскі, што забясьпечыла вашаму раёну датэрмінове выкананьне фінансавага пляну IV кварталу?

— У аснову ўсёй нашай работы па мабілізацыі сродкаў,—гаворыць тав. Кудзельскі,—намі пакладзена правядзеньне масавай растлумачальнай работы сярод шырокіх мас калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў, прычым кампанія па мабілізацыі сродкаў і рэалізацыі пазыкі «4-га завяршаючага» арганічна зьвязаны з усімі іншымі гаспадарча - палітычнымі кампаніямі, якія намі зараз праводзяцца на вёсцы.

Раённы актыў, які райком партыі пасылае ў вёску для дапамогі сельсаветам і калгасам, атрымлівае чоткія дырэктывы—поруч з выкананьнем заданьня па збожжазагатоўках, мясазагатоўках, адгрузцы бульбы Ленінграду і шэраг іншых кампаній, аказаць усямерную садзейнасьць сельсаветам у справе выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, прычым галоўнае—выкананьне нашых дырэктыў нам акурат на кожную дэкаду правяраецца на бюро райкому.

Мы дамаглися таго, што аб выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў гаворыць ня толькі актыў, але і ўсе калгаснікі і перадавыя аднаасобнікі раёну. Трэба сказаць, што рашаючым фактарам датэрміноваго выкананьня Заслаўскім раёнам пляну мабілізацыі сродкаў было тое, што намі ўжываліся і ўжываюцца апраўдаўшыя сябе сацыялістычныя мэтады работы, чырвоная і чорная дошкі, рагожны сьцяг, грамадзкі буксір перадавымі адстаючых, пачэсныя граматы прэміраваньне сапраўдных ударнікаў фінансавага фронту. Гэтыя мэтады глыбока ўкарэнены ў практыцы нашай работы і па прыкладзе раённых арганізацый яны зараз шырока ўжываюцца амаль усімі сельсаветамі і калгасамі раёну.

Падамо прыклад. За чарапанныя тэмпы ў справе мабілізацыі сродкаў Гатовінскаму сельсавету на пашыраным пленуме быў перададны рагожны партфэль. І што-ж. Гэты сельсавет мабілізаваў усю грамадзкасьці і на працягу толькі адзнай дэкады выканаў замаль 70 проц. квартальнага пляну. Гэтыя-ж мэтады былі шырока папулярызаваны і ў Заслаўскім, Слабошкім, Рогаўскім, Анусіцкім сельсаветах, якія раней цягнуліся ў хвасьце па мабілізацыі сродкаў, цяпер яны на першым месцы.

Сэкцыянэры і дэпутацкія групы Заслаўскага мессавету, прыняўшы зык лік дэпутатаў Масквы, шырока разгарнулі работу па рэалізацыі ўзятых на сябе абавязацельстваў. Мэтадамі сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж сэкцыямі і дэпутацкімі групамі яны дамаглися выкананьня ряду канкрэтных мерапрыемстваў. Фінансава-падатковая сэкцыя мессавету правяла вялізарнейшую работу ў галіне мабілізацыі сродкаў. Яна разьбіла ўвесь свой актыў па калгасах і вёсках, на мясцох была разгорнута масавая работа па барацьбе за атрыманьне права на рапарт да XV гадавіны за выкананьне фінпляну IV кварталу на 50 проц. У выніку праведзенай работы фінплян па мессавеце быў перавыкананы. На 1-га лістапада квартальны плян выкананы на 76,3 проц..

У выніку шырока праведзенай масава - растлумачальнай работы, мабілізацыі працоўных вакол выкананьня і перавыкананьня пляну мабілізацыі сродкаў, Заслаўшчына сустракае пленум ЦК КП(б)Б выкананьнем пляну мабілізацыі і сродкаў IV кварталу на 110 проц., у тым ліку па добраахвотных плацяжох - па 106,1 проц., выкананьнем гадавога пляну мабілізацыі сродкаў—на 122,6 проц., рэалізацыяй акцый Трактарацэнтру — на 130 проц. і пазыкі «4-ты завяршаючы»—на 111 проц. Пры гэтым квартальны плян па ўкладах у ашчадкасу выкананы на 421 проц., а гадавы плян—на 185 проц.

Выкананьне пляну рэалізацыі акцый Трактарацэнтру дало магчымасьць МТС у гэтым годзе адшасьці трактарны парк, замяніўшы «Фордзоны» больш магутнымі «інтэрнацыяналямі», якія замест двух плугоў цягнуць чатыры. Павялічана колькасьць складаных уборачных машын і г. д.

Сыстэма спажывецкай каапэрацыі дамаглася бліскучых вынікаў у справе каапэраваньня насельніцтва, спагнаньня паявых узносаў, выкананьня пляну па тавараэвароце. Сыстэма каапэрацыі практыкуе брыгадны мэтад абходу для праверкі ўнясеньня паявых узносаў. За добрую работу сельСТ уручаюць пераходны сьцяг. СельСТ, атрымаўшы пераходны сьцяг, атрымлівае на 25 проц. больш прамта вараў, а кіруючыя работнікі сельсавету атрымліваюць на 25 проц. больш заработнай платы за ўвесь час знаходжаньня ў гэтым сельсавеце пераходнага сьцягу.

Жанчыны — ударніцы фінансавага фронту прымаюць актыўны ўдзел у выраўненьні фінансавых задач раёну. Ударнікі — **Зубкоўская, Рыва Рыдушына, калгасьніца Шляхцёнак** — за актыўную работу па рэалізацыі пазыкі некалькі раз прэміраваліся. Не адстаюць і ўдарнікі — **Ваўчок Янка Жызьнеўскі Тодар, Дубовік Казімір, Рацько, Сіманчук Кастусь** і рад іншых. Ды ці-ж пералічыш усіх іх. У раёне зараз налічваецца звыш 250 актыўных ударнікаў фінансавага фронту, з якіх 150 па некалькі разоў прэміраваны.

— Скажэце, тав. Кудзельскі, як раён ашчадкаса дамаглася такога высокага процанту па ўкладах?—задаю пытаньне.

— Па-першае, мы ашчадкасе стварылі адпаведныя ўмовы для работы: выцягнулі з калідора банку, дзе яна тулілася, далі добрае памяшканьне ў цэнтры мястэчка, умацавалі кіруючы склад добрымі работнікамі, адкрылі філіялы ва ўсіх сельсаветах, аддаем штодня максымум увагі рабоце ашчадкасы. Гэтыя фактары зьявіліся стымулам да пасьпяховай работы райашчадкасы. Райашчадкаса ў сваю чаргу мабілізавала камсамольскія і піянэрскія арганізацыі, прафсаюзы, фінансавы актыў для вярбоўкі ўкладчыкаў

Пастанова № 729 Народнага Камісарыяту Земляробства БССР ад 19 кастрычніка 1932 г.

У выкананьне пастановы Савету Народных Камісараў БССР ад 4-га кастрычніка 1932 году пра мерапрыемствы па барацьбе з бруцэлёзам (інфэкцыйны аборт) жывёлы і захворваньнем бруцэлёзам людзей.

Наркамзем БССР пастанаўляе:

1. Унесьці бруцэлёзныя захворваньні ў групы хвароб, якія падлягаюць абавязковай рэгістрацыі, забясьпечыўшы рэгістрацыю наяўнага складу хворай жывёлы, так і нанова ўзьнікаючых выпадкаў захворваньняў бруцэлёзам.

2. Абавязаць усе гаспадарчыя сыстэмы. РАЙЗА і ГАРЗА выплачваць бруцэлёзныя гаспадаркі да 1-XI. Сьпіс паказаных гаспадарак даць НКЗему да 2-XI г.г. Пры вылучэньні бруцэлёзных гаспадарак неабходна ўлічыць поўную ізаляцыю іх як у зімовы пэрыяд, так і ў пэрыяд выпасу.

3. Абавязаць Віцебскі, Магілеўскі навукова-дасьледчыя інстытуты безагаворачна выканаць пастанову НКЗему ад 29-XI—32 году аб разгортваньні работы на апорных пунктах: брыгадзе Віцебскага вэткамбінату па Аршанскім і Менскім Сьвінаводтрэстах, Магілеўскаму НДІ па Магілеўскім Сьвінаводтрэсьце і Племсьвінаводтрэсьце і Віцебскаму НДІ па Менскім і Гомельскім Молпрамтрэстах.

4. Абавязаць Віцебскі, Магілеўскі НДІ, Гомельскую занальную станцыю распрацаваць не пазьней 15-XI—32 году наступныя мерапрыемствы па бруцэлёзе:

а) эцыялёгію бруцэлёзу, крыніцы за ражэньня і шляхі пераносу інфэкцыі, дакладную дыягностыку, агульную і спэцыяльную профілактыку, клініку і тэрапію;

б) для выкананьня гэтай работы арганізаваць пры Магілеўскім НДІ лябораторыю па бруцэлёзе сьвіней, пры Віцебскім НДІ лябораторыю па бруцэлёзе буйнай рагатай жывёлы, пры Гомельскай занальнай станцыі лябораторыю па дробнай хатняй жывёле да 1-XI-32 году.

Абавязаць тав. Мясьнікова, Пасманіка і Пісарава ўкамплектаваць гэтыя лябораторыі ў паказаны тэрмін кадрамі.

5. Усім вэтлябараторыям у тэрміновым парадку прыстасаваць лябараторыі для масавага дасьледваньня крыві, па рэакцыі аглюцынацыі і бактэрыялёгічным дасьледваньні на бруцэлёз.

Усю неабходную апаратуру атрымаць праз склад вэтснабпрому і аптэкаўпраўленьня з такім разьлікам, каб з 25-X—32 году праводзіць масавае дасьледваньне.

6. Абавязаць Белкантору вэтснабпрому ў тэрміновым парадку забясьпечыць усімі запатрабаваньнямі па апаратуры вэтбакустаноў.

7. Прасіць Народны Камісарыят Аховы Здароўя даць дырэктыву аптэкаўпраўленьню адпусьціць апаратуру, якая ў іх ёсьць, па запатрабаваньні вэтбакустаноў.

Абавязаць усе саўгастрэсты і спэц калгасцэнтры з 25-X—32 г. правесьці пагалоўнае абсьледваньне ўсёй жывёлы на бруцэлёз, прадугледжанае плянам комплексу прафілактычных вэтсанітарных і мэдыкасанітарных, гігіенічных і супрацьэпізоотычных і супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў.

УВАГА: У комплекс мерапрыемстваў агульнага характару павінны ўваходзіць: а) дакладная і своячасовая дыягностыка бруцэлёзу, клінічная і бактэрыялёгічная сэролёгічная);

б) папярэджаньне распаўсюджаньня бруцэлёзу паміж насельніцтвам;

в) лёкалізацыя і зьнішчэньне бруцэлёзу;

г) вучот заражэньняў і захворваньняў бруцэлёзам сельскагаспадарчай жывёлы і насельніцтва ў недабрабытных па бруцэлёзе пунктах, а таксама мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў гаспадарках, прышчэпкі, дасьледваньні і г. д.;

д) правядзеньне мерапрыемстваў па папярэджаньня заносу інфэкцый у дабрабытныя гаспадаркі.

9. Даручыць саўгастрэстам і спэцкалгасцэнтрам комплексныя мерапрыемствы правесьці перш за ўсё ў гаспадарках жывёлагадоўчых, саўгасах і калгасна-таварных фэрмах і ў першую чаргу ў гаспадарках племянных, якія здавальняюць насельніцтва малаком і малочнымі вырабамі.

10. У стадах як савецкіх, калгасных гаспадарак, так і тых, што знаходзяцца ў аднасобным карыстаньні калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, праводзяцца мерапрыемствы адзначаныя ў папярэднім артыкуле у вбавязковым парадку.

Поўны комплекс мерапрыемстваў праводзіцца па загадзе райвэтурача, райвэтінспэктара і райаддзелу аховы здароў'я, або вышэйшых зямельных устаноў, або аховы здароў'я у выпадку пагрозы распаўсюджаньня інфэкцыі.

11. У мэтах плянавых масавых дыягностычных дасьледваньняў павінна ўжывацца выключна сэролёгічная рэакцыя аглюцынацый і бактэрыялёгічнае дасьледваньне запалаэороных на клінічных адзнаках жывёлы і людзей мэтадамі апрацаванымі Наркамземам і НК аховы здароў'я.

II. Разьбіўка гаспадарак у адносінах дабрабытнасьці іх па бруцэлёзах

12. У залежнасьці ад ступені дабрабытнасьці гаспадарак па бруцэлёзах, гэткія падзяляюцца на дабрабытныя, умоўнадабрабытныя, недабрабытныя і сапраўды бруцэлёзныя гаспадаркі.

13. Клінічнымі адзнакамі, якія даюць падставу западозрыць наяўнасьць бруцэлёзу ў гаспадарцы зьяўляюцца: выкідышы, затрыманьне пасьледу, запаленьне маткі і цячэньне з палавой шчэлі, двухразовая ялавасьць, калі добра вядзецца вучот злучкі, імпатэнцыя вытворнікаў, архіты, перэатрыты, у сьвіней акрамя гэтага запаленьне суставаў, артрыты; у людзей індулюючая ліхаманка, паліартрыты, палінэўрыты, архіты. Пры адсутнасьці адзначаных сымптомаў, а таксама пры адмоўных выніках праробленых бактэрыялёгічных або сэролёгічных дасьледваньняў, гаспадарка лічыцца дабрабытнай па бруцэлёзе.

14. УМОЎНА ДАБРАБЫТНЫМІ лічацца гаспадаркі пасьля выдаленьня з іх бруцэлёзнай жывёлы.

15. Недабрабытнымі па бруцэлёзе лічацца гаспадаркі, у якіх бактэрыялёгічна, або сэролёгічна знойдзены выпадкі бруцэлёзу да правядзеньня ў гэтых гаспадарках комплексу мерапрыемстваў і да вываду з апошніх усёй бруцэлёзнай жывёлы, прычым, калі колькасьць апошніх да моманту ачысткі была больш 10 проц. агульнага пагалоўя, дык гаспадарка застаецца ў катэгорыі недабрабытных і пасьля вываду з яе бруцэлёзнай жывёлы пакуль гаспадарка ня будзе даведзена да поўнага дабрабыту.

16. САПРАЎДЫ — БРУЦЭЛЁЗНЫМІ гаспадаркамі лічацца гаспадаркі, у якіх згуртавана бруцэлёзная жывёла.

Гэткія гаспадаркі павінны мець зусім ізалёваныя выпасы, вадапоі, памяшканьні, асаблівы інвэнтар і асаблівы пэрсанал па даглядзе, якія не павінен мець ніякага дакрананьня да здаровай жывёлы.

УВАГА: а) у паасобных выпадках, пры адсутнасьці магчымасьці стварыць самастойныя бруцэлёзныя гаспадаркі, дазваляецца вызначэньне ў гэтай жа гаспадарцы ізалёванага ву частку для бруцэлёзнай жывёлы гэтай-жа гаспадаркі, толькі на адлегласьці ня менш, як з клм. ад дабрабытнага стада і пры поўным захаваньні ўсіх абмяжаваньняў, якія паказаны ў гэтай пастанове;

б) пры невялікай колькасьці бруцэлёзнай жывёлы і жывёлы, якая ня мае племзначэньня, і пры немагчымасьці і немэтазгоднасьці заводзе гаспадарчага абмежкаваньня арганізоўваць з іх адпаведную бруцэлёзную ячэйку, можна з дазволу вышэйшых гаспадарчых арганізацый выбракаваць такую жывёлу непасрэдна на мяса, або з папярэдняй здачай на адкорм, нагул.

17. Жывёла саўгасных, калгасных гаспадарак з усімі відамі жывёлы ўспрыймальнымі на бруцэлёз, перагрупоўваецца па гаспадарках у межах гэтай-жа катэгорыі (дабрабытных, умоўна-дабрабытных, недабрабытных і сапраўды бруцэлёзных).

УВАГА: усе адзначаныя перагрупіроўкі павінны рабіцца заўсёды па ўзгадненьні з райвэтсанаглядам і санаглядам

III. Агульнае прафілактычнае мерапрыемства ў дабрабытных і ўмоўна-дабрабытных гаспадарках

18. Пры арганізацыі новых жывёлагадоўчых гаспадарак павінна быць улічана дабрабытнасьць мясцовасьці па бруцэлёзе і выбар месца павінен рабіцца камісіяй з абавязковым удзелам прадстаўнікоў ад раённых вэт-і са нарганізацый, заключэньне апошніх зьяўляецца абавязковым і можа быць адменена толькі вышэйшымі і вэт і сан органамі.

19. Укамплектаваньне гаспадарак дабрабытных па бруцэлёзе ўсімі відамі жывёлы павінна рабіцца выключна жывёлай якая не паражона гэтай хваробай.

20. Жывёла, якая паступае ў гаспадаркі павінна накіроўвацца з месца ад праўкі з вэтпасьведчаньнямі аб дабрабытнасьці раёну і пункту па бруцэлёзе.

21. Пры паступленьні ў гаспадаркі жывёлы незалежна ад стану здароўя, а таксама наяўнасьці вэтпасьведчаньня жывёла павінна вытрымлівацца ў карантыне і ў той-жа час падлягае двухразовому дасьледваньню рэакцыяй аглюцынацыі з прамежкамі ў 12—14 дзён.

Пры атрыманьні ў агульных выпадках адмоўнай рэакцыі, жывёла дапускаецца ў агульнае стада або памяшканьне.

У выпадках станоўчай рэакцыі—жывёла перадаецца ў бруцэлёзны гаспадаркі або на забой, адкорм, нагул.

Жывёле, якая дала сумніцельную рэакцыю, у карантыне робіцца у другі раз дасьледваньне, аж да атрыманьня поўных вынікаў.

22. У сувязі з тым, што ёсьць магчымасьць супольнага заражэньня бруцэлёзам буйнай рагатай жывёлы, авечак, сьвіней, коняй, трусоў і птушак, у камбінаваных гаспадарках павінны быць паасобныя ізаляваныя сэкцыі па ўсіх відах жывёлы.

23. Злучка здаровых матак павінна рабіцца толькі са здаровымі вытворнікамі, якія абслугоўваюць тэтую гаспадарку.

УВАГА: а) Для абслугоўваньня калгасамі вакольных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вылучаюцца асобыя загадзя вядомыя, здаровыя вытворнікі, якія павінны трымацца зусім ізалявана ад стада гэтай гаспадаркі і злучка павінна рабіцца зусім па-за тэрыторыяй сядзібы саўгасу, або калгасу, з якіх вылучаны вытворнікі;

б) калі вылучаныя вытворнікі ў часе злучкампаніі трымаліся ў абслугоўваемых імі гаспадарках, дык пры звароце ў грунтоўную гаспадарку яны вытрымліваюцца ў карантыне і два разы дасьледваюцца па рэакцыі аглюцынацыі, у выпадку адмоўнай рэакцыі пераводзяцца ў агульнае стада.

24. Цяжарныя маткі не пазьней 5—7 дзён да радоў пераводзяцца ў спэцыяльныя радзільныя аддзяленьні. Вывод дзяцца з апошніх у агульныя стады, або памяшканьні, праз такі самы тэрмін пры ўмове поўнага аслабаненьня ад пасьледу і спыненьня выдзяленьня з родавых месц, а ў неабходных выпадках пасьля адмоўных вынікаў дасьледваньня крыві. У сумніцельных выпадках, (нараджэньне няжывога плоду, слабога, неданошанага, нежыцьцяздольнага, зьмена пладовых абалонак і г. д.)—няжывы плод падлягае бактэрыялёгічнаму дасьледваньню, а матка пераводзіцца ў ізалятар бактэрыялёгічнага і двухразовага сэролёгічнага дасьледваньня і лячэньня.

Пры адмоўных выніках дасьледваньня, яна накіроўваецца ў агульнае стада пасьля поўнага ачышчэньня ад пасьледу і спыненьня выдзяленьня з палавых органаў, а пры станоўчых—у бруцэлёзныя стады, або на адкорм, нагул, забой, таксама пасьля ачышчэньня і спыненьня выдзяленьняў.

25. Дзёньнікі (станкі) у радзільных памяшканьнях павінны быць ачышчаны і прадэзынфікаваны перад прыводам і пасьля ўводу маткі.

Радзільныя памяшканьні павінны быць забясьпечаны дастаткова чыстай падсьцілкай, якая пасьля звычайных родаў убіраецца ў хавальні гною, а ў сумніцельных выпадках зьнішчаецца сумесна з абарціраваным плодам і выдзяленьнямі (спальваюцца), або зарываецца ў зямлю за межамі тэрыторыі сядзібы на спэцыяльна адведзеным месцы на глыбіні ня менш мэтра.

26. Пасьлед пладовай абалонкі, заб раныя выдзяленьні пасьля родаў выносяцца з радзільнага памяшканьня ў непранікальнай пасудзе і зьнішчаюцца таксама як паказана ў артыкуле 25.

27. Пры нараджэньні прыплоду незабходна ужыць наступныя захады: рост і ноздры безадкладна ачысьціць ад сьлізі і абмыць 3—5-процантным растворам борнай кіслоты, пупачны канацік перавязваецца прадвэзнфікаванай ніткай, адрэзваецца і рана дызэнфікуецца; народжаны абціраецца ад сьлізі. Пры затрыманьні першародзнага калу робіцца лёгкая клізма. Непатрэбна дапускаць аблізваньня маткай сьлізі з народжанага.

28. Цяляты павінны трымацца асобна ад маткі ў целятніках—прафілакторыях і выпойваюцца малаком ад маткі. Першыя два тыдні целятнік трымаецца пад адным дахам з радзільным аддзяленьнем з мэтай магчымасьці выпойваць іх малаком маткі зараз-жа пасьля дойкі. У гаспадарках Жывёлаабъяднаньня цяляты мэтызаваныя жывёлы могуць гадавацца пад маткай да адлучэньня. Парасяты, ягняты і казляты гадуюцца пад маткай да адлучэньня і пасьля гэтага адлучаюцца.

29. Пэрсанал, які абслугоўвае памяшканьне для маладняка, для матачнага складу і вытворнікаў, павінен быць забясьпечаны спэцвопраткай, якая захоўваецца ў асаблівых шафах або ў асаблівым памяшканьні.

30. Катэгарычна забараняецца перасоўваньне з тэрыторыі недабрабытных памяшканьняў (сядзібы) у дабрабытныя: кармоў, унутранага абсталяваньня і рэчаў дагляду (лапаты, вёдры, мётлы і г. д.).

31. Сурова забараняецца ўваход на тэрыторыі памяшканьняў для жывёлы і ў самае памяшканьне стороннім асобам за выключэньнем тых, што прыбываюць у гаспадарку па службовых справах, якія дапускаюцца толькі з дазволу адміністрацыі і ветнагляду гаспадаркі і пры ўмове выкананьня правілаў унутранага распарадку (адзяваньне халатаў, выціраньні і дызэнфікаваньне абутку).

32. Забараняецца дакранацца і абслугоўваць дабрабытныя гаспадаркі хворым, або перахварэўшым бруцэлёзам (мальтыйскай ліхарадкай) да зьмяшчэньня ў іх клінікі і станоўчай рэакцыі аглюцынацыі РАЙТА.

IV. Мерапрыемствы ў недабрабытных гаспадарках

33. Увыпадку абортаў у гаспадарках або несвячасовых родаў, адмаі страцыі і вэтпэрсанал гаспадаркі па вінны зараз-жа рабіць наступнае:

а) абартываваўшую жывёлу вылучыць з агульнага стада ў ізалятар;

б) накіраваць у лябараторыю матарыял для бактэрыялёгічнага дасьледваньня;

в) паведаміць абслугоўваючы гаспадарку вэтпэрсанал для ўжыцьця захадаў і санпрафілактыкі ў адносінах людзей, якія абслугоўваюць жывёлу гэтай гаспадаркі;

г) пры выяўленьні бруцэлёзу тэрмінова паведаміць аб гэтым трэст, або калгасаюз і г. д., якім падпарадкавана гэтая гаспадарка, а таксама вэтурача, вэтінспэктара і райаддзел аховы здароўя.

34. Памяшканьне, дзе знаходзілася абартываваўшая жывёла, а таксама вакольную тэрыторыю неадкладна ачысьціць ад гною, падсьцілкі, рэшткаў корму, каляплоднай вадкасьці і выдзяленьняў з палавых органаў; без адкладна зрабіць дызэнфэкцыю.

35. Абартываваны плод з палавымі абалонкамі да агляду яго вэтпрацаўніком павінен захоўвацца ў ізалятары ў непранікальнай пасудзе.

36. Пасьля агляду плод накіроўваецца ў бакустанову для бактэрыялёгічнага дасьледваньня. Пры адмоўным паказаньні бактэрыялёгічнага дасьледваньня, дырэкцыя праз 3 тыдні пасьля аборту кроў ад абартываваўшай маткі накіроўвае ў лябараторыю на дасьледваньне.

УВАГА: пры адмоўным, або няпэўным выніку дасьледваньня крыві — дасьледваньне паўтараецца пасьля двух тыдняў пасьля першадасылкі крыві.

37. Пры ўстанаўленьні бактэрыялёгічным, або сэролёгічным мэтадам першых выпадкаў бруцэлёзу, у гаспадарцы павінны тэрмінова праводзіцца наступныя мерапрыемствы:

а) жывёла, у якой выяўлена заражонасьць бруцэлёзам тэрмінова ізалюецца і па ўзгадненьні з вышэйшымі арганізацыямі накіроўваецца ў паказаную імі бліжэйшую спэцыяльную бруцэлёзную гаспадарку;

б) праводзіцца добрая мэханічная ачыстка і дызынфэкцыя памяшканьняў, якая паўтараецца па ўказаньні вэтнагляду ва ўвесь час недабрабытнасьці гаспадаркі;

в) усё пагалоўе (буйная рагатая жывёла з 6-ці месяцаў, авечка з 3-х месяцаў, сьвіньні з 4-х месяцаў), падпадае 3-разоваму, з прамежуткамі 12—14 дзён, дасьледваньню па рэакцыі аглюцынацыі з паступовым вылучэньнем станоўча рэагуючых у бруцэлёзныя гаспадаркі.

УВАГА: у авечагадоўчых гаспадарках дасьледуюцца па рэакцыі аглюцынацыі толькі матачныя склад і вытворнікі, пры наяўнасьці ў апошніх станоўчай рэакцыі дасьледуецца ўсё пагалоўе, пачынаючы з трохмесячнага ўзросту.

38. Гаспадаркі недабрабытныя і ўмоўна-дабрабытныя могуць лічыцца дабрабытнымі, калі два апошніх дасьледваньні па рэакцыі аглюцынацыі ўсяго пагалоўя і трэцяе дасьледваньне для матачнага складу праз 20-30 дзён пасьля родаў далі адмоўныя вынікі, але не раней аднаго году з пачатку работ па зьнішчэньні бруцэлёзу.

V. Мерапрыемствы ў сапраўды бруцэлёзных гаспадарках

39. Ва ўсіх гаспадарках, дзе згрупавана бруцэлёзная жывёла, ужываюцца наступныя захады:

а) гаспадарка абвяшчаецца недабрабытнай па бруцэлёзе і знаходзіцца ў карантыне да поўнай выбракоўкі з яе ўсёй жывёлы, успрыймаванай на бруцэлёз;

б) бруцэлёзныя гаспадаркі не павінны мець ніякага збліжэньня са здаровымі і ўмоўна здаровымі пунктамі і гаспадаркамі. Забараняецца сумесны выпас, вадапой, купаньне, злучка, абслугоўваньне;

в) вывад з гаспадаркі ўсіх відаў жывёлы ўспрыймальнай на бруцэлёз дазваляецца толькі пры выбракоўцы апошняй на мяса, на адкорм, нагул або іншую бруцэлёзную гаспадарку, ва ўсіх выпадках з дазволу вэтурача;

г) забараняецца вывад жывёлы на выстаўкі, выводкі і г. д.;

д) камплектаваньне гэтых гаспадарак робіцца выключна бруцэлёзнай жывёлай па нарадах адпаведных гаспадарчых арганізацый;

е) жывёла абартываваўшая вылучаецца ў спэцыяльныя ізалятары для лячэньня шляхам прамываньня полавых шляхоў органаў, маткі, цёплым 1—2 процантным растворам соды або 1 проц. раствору лізолю, 1:500 марганцава-кіслым калієм і г. д. У ізалятары жывёла трымаецца не менш 2-3 тыдняў і пераводзіцца у агульную групу бруцэлёзнай жывёлы пасьля поўнага спыненьня выдзяленьня з палавых месц;

ж) абартываваўшая жывёла дапускаецца да злучкі не раней 3-х месяцаў пасьля аборту і пры ўмовах адсутнасьці выдзяленьняў з палавых месц;

з) злучка робіцца толькі з вытворнікамі гаспадарак вылучанымі для бруцэлёзных гаспадарак. Дапускаецца злучка станоўча рэагуючымі вытворнікамі толькі натуральным шляхам і з адмоўна рэагуючымі вылучанымі для гэтай гаспадаркі толькі шляхам штучнага абсямяненьня.

и) жывёла, паражоная бруцэлёзам неадкрытымі формамі туберкулёзу вылучаецца ў асобныя стада, прычым жывёла малакампутуючая ў племянных і прадукцыйных адносінах па заключэньні ветэрынарна-зоатэхнічнай камісіі выбракоўваецца для забою на мяса.

40. З бруцэлёзных гаспадарак, дзе выдапой робіцца з адкрытых цякучых вадаёмаў, бруцэлёзная жывёла павінна ўтварацца малаком ад дабрабытных па бруцэлёзе кароў, або малаком пастэрызаваным;

г) да пераводу ў карантын маладняка, робіцца мэханічная ачыстка і дызынфэкцыя ўсяго цела, амаль да капытоў;

д) гаспадаркі, куды пераводзяцца цяляты паведамляюцца аб тым, што яны паходзяць ад гаспадаркі бруцэлёзнай або недабрабытнай па бруцэлёзе пасьля адмоўнага выніку трохразовага дасьледваньня крыві.

Увага: З недабрабытных гаспадарак маладняк пераводзіцца спачатку ва ўмоўна-дабрабытныя па бруцэлёзе гаспадаркі.

VI. Ахова абслугоўваючага пэрсаналу ў недабрабытных па бруцэлёзе гаспадарках

48. Увесь пэрсанал у недабрабытных бруцэлёзных гаспадарках павінен праходзіць дыспансэрны агляд і дасьледваньне крыві па рэакцыі Райта ня менш двух разоў у гаду. Нанова прыняты пэрсанал павінен прайсьці папярэдні мэдагляд.

49. Пэрсанал, які абслугоўвае жывёлу ў гаспадарках паказаных у п. 48, павінен быць інструктаваны пры паступленьні вэт-і мэдагляданым аб захадах уласнай прафілактыкі. Апроч таго ня менш як два разы ў год абслугоўваючы пэрсанал праходзіць кароткатэрміновыя курсы для азнаямленьня з мэтадамі барацьбы з бруцэлёзам і для ўласнай прафілактыкі.

50. Абслугоўваючы пэрсанал павінен быць забясьпечаны паштучнай спэцвопраткай: касцюм з гладкай шчыльнай тканіны, прапітаваны або гумовы фартух, скураныя або брэзэнтавыя рукавіцы, скураныя боты або гумовыя гапцы.

Увага: Рукавіцы для асоб, якія ня могуць іх ужываць па роду сваёй работы (вязкі і г. д.) не выдаюцца.

51. Спэцвопратка і абутак павінны дызэнфікавацца згодна ўказаньня вэт пэрсанала.

52. Катэгарычна забараняецца хадзіць ў спэцвопратцы і спэцабутку ў памяшканьні здаровай жывёлы, у месцах агульнага карыстаньня і інш.

53. Пры выходзе з памяшканьня для жывёлы пасьля работы пэрсанал ў абавязковым парадку павінен мыць рукі з мылам, шчоткай, з дэзынфэкцыяй згодна ўказаньня ветнагляду. Для гэтай мэты ў кожным памяшканьні, дзе ўтрымліваецца жывёла, павінны быць рукамыйнікі, шчоткі для рук, ручнікі, мыла і дызэнфэкуючыя растворы.

Увага: Дызэнфэкцыя рук і памяшканьняў у малочных гаспадарках па вінна рабіцца непахучымі прадметамі з мэтай папярэджаньня псаваньня малака.

54. Асобы, у якіх парушаны цэласьць скуры на руках (параненьне, выбітасьць і г. д.) недапускаюцца да работы ў недабрабытных памяшканьні для догляду за недабрабытнай жывёлай аж да агляду вэтпэрсаналам.

VII. Перасылка матар'ялаў для бактэрыялёгічнага і сэролёгічнага дасьледваньня

55. Для бактэрыялёгічнага дасьледваньня накіроўваецца з нарачным цэлы плод (цяляты без галавы і ног) сумесна з пладовай абалонкай або з не паражонай часткай (у жывачных) 2-5 катэлёдонамі, увесь страўнік са зьмясьцівам (сычуг у жвачных, страўнік у сьвіней). Прычым абсцывы кацы у спраўніка перавязваюцца. Адзначаны матар'ял павінен накіроўвацца ў непранікальнай пасудзе ў дзень аборту, не пазьней наступнага дня, пры ўмовах захаваньня на холадзе. У выпадку немагчымасьці з-за вялікай адлегласьці перасылаць увесь плод, або страўнік, накіроўваецца зьмясьцівам страўніка плода, для гэтага страўнік вылізваецца шпрыцам з гойстай іголкай пасасваць зьмясьцівам страўніка (досыць 1-2 куб. с.) і пры захаваньні ўмоў стэрыльнасьці пераносіцца ў стэрыльную прабірку або флакон, якія гермэтычна закупорваецца або ў пастэрыльную піпетку, якая потым запаяваецца з двух канцоў.

56. Для сэролёгічнага дасьледваньня накіраванай крыві, або сываратакі прабіркі павінны захоўвацца ў вэртыкальным становішчы. Сываратка крыві ў цёплы час году кансэрвуецца 0,5 проц. крысталічнай карболовай кіслатой (на 10 куб. с. сываратакі 1 куб. с. 5 проц. раствору) і можа быць дасланая як у запаенай піпетцы так і ў гермэтычна закупораных флаконах. Кроў павінна быць дасланая ў лябараторыю не пазьней 48 гадзін пасьля узяцьця, а сывыратка не пазьней 72 гадзін. Піпеткі і флаконы павінны быць стэрылізаваны.

67. Прабіркі, флаконы і піпеткі на вінны быць з наклейкамі нумароў жывёлы ў адпаведнасьці з прыкладзе ным да іх опісам, у якім адзначаюцца: нумар жывёлы, назва, узрост, парода, тэрмін цяжарнасьці да аборту, колькасьць абортаў за апошнія гады і прычыны іх, колькі часу жывёла неданосіла плод, колькі кілых і хут капаўшых народжаных ялавасьць і не працягласьць, становішча палавых органаў (мэтрыт), колькасьць і процант абартываваўшай жывёлы, а таксама час і колькасьць праробленых раней дасьледваньняў і прышчэпак (за год раней).

IX. Прышчэпкі пры бруцэлёзе

58. Прышчэпкі можна ўтвараць у заразьлівых бруцэлёзных гаспадарках і выключна вакцынамі з забітых культур, кожны раз па ўзгадненьні з вэтпэктарамі НКЗему і вэтнавукова-дасьледчымі ўстановамі, згодна іх указаньня і толькі пры ўмове выкананьня комплексу захадаў, накіраваных да паляпшэньня санітарна-зоагігіенічнага становішча гаспадарак, па сьля вылучэньня з яе бруцэлёзнай жывёлы і пры арганізацыі поўнага вычоту выпікаў прышчэпак.

УВАГА: а) прышчэпкі жывымі культурамі катэгарычна забараняюцца, б) дасьледы з паслабленымі культурамі могуць рабіцца навукова - дасьледчымі інстытутамі і з дазволу НКЗему.

X. Дызэнфэкцыя па бруцэлёзе

59. Ізаляцыйныя памяшканьні, кармушы, а таксамі заражоныя двары ў абавязковым парадку дызэнфікуюцца ня менш аднаго разу ў цыкаду сьвежа-гашанай вапнай (0,5 кгр. на квадр. парачай вады), хлёрнай вапнай або па рачым лупам.

60. Прычым перад тым як рабіць дызэнфэкцыю трэба абавязкова падрэдзіць зрабіць ачыстку ў наступным парадку: гной, сьмецьце, падсьцілку, рэшткі кармоў прыбіраюцца і з імі далей робяць тое, што і з гноем. Пад логу і абсталяваньне пасьля механічнай ачысткі вымываюць гарачым лугам; шапаты, граблі, пады, шчоткі, фурманкі і тачкі для вывазу сьмецьця і гною, а таксама і ўсе абсталяваньні ачысты і вымыты гарачым лугам, або растворам соды. У далейшым адзначаныя рэчы абавязкова падлягаюць рэгулярнай дызэнфэкцыі згодна ўказаньня вэтурача.

61. З дызэнфэкцыйных сродкаў лепш за ўсё сьвежа-гашаная вапна, прохпроцантны раствор ёрзаліну, сярная карболевы раствор, соды і г. д.

УВАГА: Для агульнай дызэнфэкцыі знадворных пакроваў жывёлы мэтчыма рабіць абмываньне лугам.

62. Для пасьляховага санітарнага кіраўніцтва і вучоту выканаў праведзімых мерапрыемстваў па бруцэлёзе ганізаваць пры НКЗеме спэцбюро ў складзе: нач. вэтгіраўніцтва тав. Грузкова (нач. бюро) і дырэктароў Магілеўскага і Віцебскага НДІ Місьнікова і Пасманіка. Працаць НКАховы ад роўя выключыць у бюро свайго прадстаўніка, абавязаўшы бюро забясьпечыць санітарнае кіраўніцтва па вылучаньні гэтай пастановы.

63. Дырэктары саўгасаў, праўленьні калгасаў, а таксама і аднасобнікі—ўласьнікі жывёлы, якія будуць утойваць хваробу бруцэлёзам жывёлу або несвячасова заяўляць вэтпэрсаналу—сельгазаеты, а таксама вэтпэрсанал, які атрымоў весткі аб выяўленым бруцэлёзе або падозрэньні на бруцэлёз і ня ўжыўшы адпаевдных захадаў—прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці.

Нам. Наркома Земляробства БССР МАСЮКОЎ

Нам. нач. Вэтэктару НКЗЬ САЛАМЕВІЧ

Хроніка

▲ Для аказаньня практычнай дапамогі низавым арганізацыям Магілеўскага чыгуначнага вузла ў падрыхтоўцы да III усесаюзнага конкурсу спаваных брыгад, на вузле працуе выязная рэдакцыя Жлобінскай раённай транспартнай газэты «Ударнік».

▲ 50 новых рацыяналізатарскіх прапаноў абавязаліся ўнесьці ў сацыклад другой пяцігодкі, а таксама арганізаваць ячэйкі вынаходцаў у падшэфных калгасах—вынаходцы Віцебскай гарбарні.

▲ Зьлёт маладых герояў-ударнікаў першай пяцігодкі Сененскага раёну склікаецца 5-га сьнежня.

▲ Вытворчую экскурсію выпускнікоў школы ФЗВ пры заводзе імя Ляцукевіча ў Маскву арганізоўвае Гомельскі гарсавет АПТЭ.

▲ Рэдкалегія газэты «Друкарская Праўда» атрымала ліст з Сафіі (Баўгарыя), у якім кіраўнік рабкоўскага руху пры ЦК рэвалюцыйных прафсаюзаў у Сафіі прасіць паладзіць сувязь рабкораў-друкарні імя Сталіна з рабкораўскім гурткам Сафійскай дзяржаўнай друкарні, у якой працуе 700 рабочых.

▲ 11.000 кілёграм рознай утыльсыравіны сабрана на 22 лістапада Віцебскім райсаветам фізкультуры. Напэрадзе ідуць калектывы акулярнай фабрыкі, абуванай фабрыкі «Дзьвіна».

▲ Гомельская гарадзкая канфэрэнцыя т-ва «ПК», якая адбылася 25 лістапада, прызнала работу таварыства нездавальняючай. Склад кіраўніцтва і пленуму т-ва «ПК» абноўлены за лік лепшых ударнікаў гомельскіх прад прыемстваў.

▲ Зімовыя вакацыі ў вышэйшай і сярэдняй школах БССР устаноўлены з 1-га па 15-га студзеня.

▲ III пленум Цэнтральнага савету ваяўнічых бязбожнікаў БССР адбудзецца 10 сьнежня ў Маскве. Пленум падагуліць праробленую Цэнтральным саветам ВБ работу за 1932 год і абмяркуе чарговыя задачы антырэлігійнай прапаганды ў асьвятленьні пастаноў XVII партканфэрэнцыі.

▲ Народны камісарыят асьветы БССР прапанаваў усім загадчыкам АНА разгарнуць работу на стварэньні харчовых баз для забясьпечаньня вучняў школ гарачымі сьнеданьнямі, а таксама скарыстаць мясцовыя майстэрні і арцелі для вырабу і рамонту вучнёўскага абутку і вопраткі.

▲ Павільён усебеларускага стадыёну прыстасоўваецца для масавай здачы норм па камплексе значка «ГПА» ў зімовы пэрыяд.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Беларускае аддзяленьне рэдакцыі „Лёгкай інд стрыі", рэдакцыі газэт „Рабочий" і „Савецкая Беларусь"

склікаюць 2-га сьнежня г. г., а Наркамлегпрому БССР (заля паседжаньняў) гадз. увечары ў памяшканьні

нараду па пытаньнях забясьпеч ньня гарбарні сыравінай і ходу скурсыравінных заготовак па БССР.

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА:

рэдакцыі газэт—«Колгаснік Беларусі», «Чырвоная Зьмена», рэдактар шматтыражкі «Бальшавіка» тав. Мінкін, Рэдактар шматтыражкі абутковай фабрыкі т. Чарноцкі, Рэдактар шматтыражкі фабрыкі «Уеході», ЦК саюзу скурвікаў—Рохкін і Левінсон, Наркамлегпром—т. Драгілеў, Саюзвагатскур т. Хамелянскі і Бурштэйн, Скуртрэст—т. т. Эфроімскі і Клерын, абутковы трэст—т. т. Шэрман і Загорчык Балкавсаюз—т. т. Глікман, Брыкер і Заявштэйн, дырэктыя заводу „Бальшавік"—т. т. Бондарчук і Лёўшын, дырэктар абутковай фабрыкі—т. Кроль, складасыравіны—тав. Кан.

Прадстаўнікі павінны зьявіцца за м тар'ялам для і формацыі.

Просьба зьявіцца без запазьненьняў

Бел. Аддзяленьне «Лёгкай індустрыі»
Рэдакцыя газ. «Рабочий»
Рэдакцыя газ. «Савецкая Беларусь»

Сьпяшайцеся здаць падпіску на 1933 год на адзіны ў СССР папулярны, масавы, штомесячны, ілюстраваны часопіс па налічэньні і справаздачнасьці

„УЧЕТ В СОЦИАЛИСТИЧЕСКОМ ЗЕМЛЕДЕЛИИ"
(б. "СПУТНИК СЧЕТОВОДА")

Часопіс „Учет в социалистическом земледелии (б. „Спутник счетовода") павінен быць у кожным колгасе, саўгасе, МТС.

Часопіс „Учет в социалистическом земледелии (б. „Спутник счетовода" зьяўляецца неабходным падручнікам і даведнікам для кожнага работніка уліку і калгасьніка-актывіста.

Пры часопісе арганізавана кансультацыя па пытаньнях калгаснага ўліку.

Падпісная цана на год—2 руб. 40 кап., на 6 мес.—1 р. 20 к.

Падпіску здавайце бозадкладна ў кожнае паштовае аддзяленьне або ліставозу

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Каса ад 12 гадз.
Ад 25 лістапада — мастацкі фільм вытворчасьці саюзкіно
Чалавек застаўся адзін.

ГУЛАГЫ КІНО-ТЭАТР „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"
Каса з 1 г. дня
Ад 23 лістапада Мастацкі фільм
Штурман з „Прыбою"
Драма з 8 частак
Штодзённа сэансы, пачатак 6, 7 гадз, 30 хв. 9, 10 гадз. 30 хв Каса ад 1 гадз. дню.

ПАТРАБУЮЦЦА УПАУНАВАЖАНЫЯ
ПА БЕЛАРУСІ
па распаўсюджваньні пэрыядычных бюлетэняў
замежнага тэхнічаага вопыту выданьня інстытуту „ИНОСВЯЗЬ"
Звяроцца: Москва, Мясницкая, д. 47 „ИНОСВЯЗЬ".

ЧАЧЭВІЦКІ ТЭХНІ